Падляшскія татары ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Кастусь Казлоўскі ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 34 (2728) Год LIII | Беласток, 24 жніўня 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Яе мудрасці хапала на ўсю Беларусь

Тэкст і фота Сяргея ЧЫГРЫНА

У нядзелю, 10 жніўня, Зэльву наведалі сябры творчай беларускай інтэлігенцыі, палітыкі і журналісты з васьмі раёнаў Гродзеншчыны, а таксама з Мінска, Баранавіч і Гродна. А прыехалі яны сюды з нагоды 98-годдзя з дня нараджэння славутай беларускай паэткі Ларысы Геніюш. Сюды, у Зэльву, беларусы прыязджаюць заўсёды, каб наведаць магілу Ларысы і Янкі Геніюшаў на мясцовых могілках, ускласці кветкі, пабываць у Свята-Троіцкай царкве ў Зэльве, якую паэтка наведвала. У царкве знаходзіцца мемарыяльная дошка, прысвечаная паэтцы, на дзяцінцы пастаўлены з дазволу мітрапаліта Філарэта ёй помнік.

Дарэчы, беларусаў з кожным годам на дзень нараджэння Ларысы Геніюш у Зэльву прыязджае ўсё больш і больш. І сёлета людзей было шмат.

Спачатку ў зэльвенскай Свята-Троіцкай царкве айцец Аляксандр правёў малебен і сказаў пропаведзь у гонар нашай слыннай паэткі. У прыватнасці, ён сказаў, што Ларыса Геніюш — нацыянальная паэтка Беларусі. У яе была вялікая сіла духу, яна была мужнай і шчырай. „Верыцца, — сказаў айцец Аляксандр, — што яе творчасць будуць, як і раней, вывучаць у школах, хаця яе паэзію па-ранейшаму вывучаюць і любяць у Жыровіцкай семінарыі, і кожны семінарыст сёння можа працытаваць яе цудоўныя радкі пра Жыровічы, пра Жырава, як кажуць мясцовыя жыхары". Святар прачытаў радкі:

Жыровічы — святы для нас куточак,
Дзе цэрквы ў неба вежы ўзнялі.
На дрэве Маці Божай абразочак —
Благаслаўленне для маёй зямлі.

Пасля царквы ўсе паехалі на зэльвенскія могілкі, дзе ў 1983 годзе побач, каля мужа, Ларыса Геніюш знайшла свой вечны спачын. Гродзенская паэтка Данута Бічэль каля помніка сказала, што Ларыса і Янка Геніюшы былі простымі і мілымі людзьмі. Іх розуму, мудрасці, адвагі, шляхетнасці і сілы духу хапала на ўсю жывую Беларусь, якая не хацела жыць па чужым маральным кодэксе будаўнікоў камунізму, а хацела жыць па дзесяці Божых запаведзях. „Увесь час наша сяброўства спрабавалі разбурыць канторы, абкамы і зайздраснікі. Але мацавалася яно вялікай узаемнай патрэбай. Ларыса казала, што пасля Прагі ёй найлепей было б на хутары. Але Ларыса Геніюш пасля сталінскіх лагераў жыла ў Зэльве, куды я пастаянна прыязджала. Ларыса Антонаўна звычайна пякла печыва ў такой адмысловай дапатопнай электрычнай духоўцы. Яна была майстрыхай па печыве і караваях, але я ў яе гэтаму майстэрству не вучылася. Я прыязджала да яе не вучыцца пячы, а па натхненне", — прызналася паэтка Данута Бічэль.

Супрацоўнік Чэшскай амбасады ў Мінску Герман Хромы ўжо чацвёрты раз прыязджае ў Зэльву да Ларысы і Янкі Геніюшаў. Спадар Хромы ў сваім выступленні нагадаў, што праз два гады беларусы, а таксама чэхі, адзначаць 100-гадовы юбілей паэткі. Да гэтай даты мяркуецца ў Празе, дзе да вайны жылі Геніюшы, на адным з будынкаў будзе адкрыта мемарыяльная шыльда.

Палітык Вячаслаў Сіўчык і пісьменнік Міхась Скобла гаварылі аб тым, што даўно пара рэабілітаваць Ларысу Геніюш. Дарэчы, некалькі разоў Саюз беларускіх пісьменнікаў звяртаўся ў вышэйшыя дзяржаўныя ўстановы Беларусі аб яе рэабілітацыі, але адтуль прыходзілі толькі адмоўныя адказы. „Да просьбы аб рэабілітацыі паэткі неабходна падключыць іншыя дзяржавы", — сказаў Вячаслаў Сіўчык. „Найбольшая „віна" паэткі была ў тым, што яна вельмі любіла сваю Беларусь і хацела бачыць яе шчаслівай і вольнай, каб ніхто ніколі яе не прыніжаў, не рабаваў. Каб яна была роўнай сярод роўных", — дадаў Міхась Скобла.

Урачыстасць з дня народзінаў Ларысы Геніюш працягвалася таксама на беразе Зэльвенскага вадасховішча. Там адбылася прэзентацыя кнігі Дануты Бічэль „Хадзі на мой голас", якая пабачыла свет у Вроцлаве ў серыі „Гарадзенская бібліятэка", дзякуючы лідэру Руху „За Свабоду" Аляксандру Мілінкевічу. Гэта першая кніга прозы вядомай гродзенскай паэткі. Кніга ўспамінаў і згадак пра вялікіх і проста вядомых людзей Беларусі і Польшчы. Ёсць там і цікавыя ўспаміны пра Ларысу Геніюш, Аляксея Карпюка, Васіля Быкава, Янку Брыля і пра іншых асоб. Выступоўцы, якія казалі шчырыя словы пра кнігу Дануты Бічэль, а гэта былі пісьменнікі Васіль Якавенка і Язэп Янушкевіч, згадвалі таксама і Ларысу Геніюш. А беларускія барды Зміцер Сідаровіч, Вольга Цярэшчанка, Зміцер Бартосік цешылі ўсіх добрымі песнямі.

Пачатак развалу імперыі ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Нарэшце СНД рэальна пачаў развальвацца. Яго дэ-факта то і не існавала. Юрыдычна там штосьці падпісвалі. Але ўсе суб'екты СНД, акрамя, зразумела, Расіі, ставілі свае аўтографы прыкладна так, як злоўлены сталінскімі НКВДэшнікамі ні ў чым не вінаваты чалавек, які з-за страху за сваю сям'ю падпісваў усё, што яму казалі...

А гады плывуць і плывуць... ☞ 2

Васіль САКОЎСКІ

Чалавек — гэта такая самалюбная істота, якой, здаецца, немагчыма задаволіць, давесці да канчатковага задавальнення сабой. Яму заўсёды чагосьці яшчэ не хапае.

Калі жыццё зусім не складваецца, што бывае даволі нярэдка, чалавек марыць, канешне, аб лепшым...

Клопат з ахоўным лесам ☞ 4

Міхал МІНЦЭВІЧ

Жніво з фальклорам ☞ 5

Аляксей МАРОЗ

Фэст у Семяноўцы ☞ 12

Міра ЛУКША

9 770546 196000

Пачатак развалу імперыі

Нарэшце СНД рэальна пачаў развальвацца. Яго дэфакта то і не існавала. Юрыдычна там штосьці падпісвалі. Але ўсе суб'екты СНД, акрамя, зразумела, Расіі, ставілі свае аўтографы прыкладна так, як злоўлены сталінскімі НКВДэшнікамі ні ў чым не вінаваты чалавек, які з-за страху за сваю сям'ю падпісваў усё, што яму казалі. Усе ведалі, што Расія па-ранейшаму разглядае СНД як сваю вотчыну, і калі ім не спадабаецца чыйсьці подпіс, то могуць, каб перапісаць дакумент, прыехаць на танках.

Так і сталася. Подпісы Міхаіла Саакашвілі, якія той ставіў на думку Пуціна няправільна, патрабавалі тэрміновага ўмяшальніцтва. Патрэбная была толькі зачэпка. На міжнародным полі такой зачэпкай стала Косава. Той, хто памагаў адарваць яго ад Сербіі, забыўся, што ёсць Пуцін, які лічыць сваім абавязкам адпомсціць за гэта хоць камунебудзь, а лепш за ўсё грузінам, каб іншым суб'ектам СНД не ўздумалася паўтарыць грузінскага шляху да дэмакратыі і НАТА. А ў самой Грузіі зачэпкай сталі асеціны, якія, будучы грамадзянамі Грузіі, атрымалі шчодры падарунак з Крамля — рускія пашпарты, рускія грошы і рускіх вайскоўцаў. А тут яшчэ і Саакашвілі вырашыў разабрацца адкуль у Паўднёвай Асеціі ўзялося так шмат расіян, і чаму яны на тэрыторыі Грузіі зрабілі сваё войска.

Паводзіны Саакашвілі ніхто тут не апраўдвае. Ён чамусьці палічыў, што свой святы абавязак захаваць цэласнасць краіны і навесці на тэрыторыі Паўднёвай Асеціі канстытуцыйны парадак трэба хутка і сілай. А ці варта было спяшацца і ўвогуле так рабіць? Мог бы ўзяць прыклад з Вацлава Гавела, ці зацягваць перамовы аж пакуль Расія не разваліцца сама па сабе, што абавязкова некалі станецца. Галоўнае, каб без крыві было. Але ён паддаўся на правакацыю. А той, хто яго справакаваў, з задавальненнем пачаў бамбіць грузінскія гарады і расстрэльваць з танкаў мірных жыхароў.

Каб адна з краін Еўрасаюза напала на другую і падумаць немажліва. Але тут не Еўрасаюз, а СНД. Тут усім запраўляе імператар Пуцін. Ці, як мінімум, хоча ўсім запраўляць. Не ўмешваліся іншыя суб'екты СНД у знішчэнне чачэнскага народа, не лезлі і ў Паўднёвую Асецію і не давалі парады асецінам і грузінам як ім жыць. З цягам часу тыя і самі разабраліся б з усім і памірыліся б. Але Пуцін вырашыў, што Масква мае права сунуць нос у справы суседзяў.

Вось і атрымалі вынік. Забойствы рускімі „міратворцамі" грузінаў выклікалі шок усяго свету. Нават ніхто з суб'ектаў СНД не падтрымаў Крэмль, за што той абяцаў адпомсціць, прынамсі нам, беларусам. І сказаў гэта не нейкі там Жырыноўскі, а сам пасол Расіі ў Беларусі Сурыкаў. Агучваючы свае пагрозы, ён нават не задумаўся пра тое, што ў краін СНД ёсць падпісаныя пагадненні, што калі хтось нападзе на адну з гэтых краін, астатнія мусяць дапамагаць яе абараняць. Гэта ў дапамогу Грузіі Беларусь і іншыя павінны, паводле СНДоўскіх пагадненняў, адпраўляць войскі. Бо рускае войска ўварвалася на тэрыторыю Грузіі, а не наадварот. Бо рускія палітыкі высокага рангу, парушаючы ўсе пагадненні, сцвярджаюць, што пра цэласнасць межаў грузінскай дзяржавы можна забыцца.

Зараз ужо ўсе напалохаліся непрадказальных паводзін Крамля. І ўсе думаюць, што рабіць далей. Тыя з краін СНД, якія ўжо крыху адарваліся ад жудасных абдымкаў Масквы, як Украіна, будуць уцякаць у НАТА хутчэй, чым лётаюць рускія самалёты. І нават такія як Беларусь, што па-халуйску загульвалася ў саюзную дзяржаву, зараз таксама не мае іншага выйсця. І ўсё больш і больш людзей пачынаюць тое разумець.

А што тычыцца Грузіі, то гэтую вайну яна выйграе. Нават эстонцы ўжо паслалі за яе свае войскі. Іншыя таксама пашлюць.

А вось Расія не мае больш шанцаў стаць нармальнай дэмакратычнай краінай у тым тэрытарыяльным выглядзе, які мы ведаем сёння. Расію, на якую спадзяваўся ўвесь цывілізаваны свет як на саюзную і сяброўскую дзяржаву, загубілі Пуціны і Мядзведзевы. Гэта ім не шкада ні грузінскай крыві, ні крыві рускага салдата. Але як і ўсе захопнікі яны не заўважаюць, што іх імперыя пачала распадацца. І Грузія стала пачаткам іх канца.

Віктар САЗОНАЎ

А гады плывуць і плывуць...

I

Чалавек — гэта такая самалюбная істота, якой, здаецца, немагчыма задаволіць, давесці да канчатковага задавальнення сабой. Яму заўсёды чагосьці яшчэ не хапае.

Калі жыццё зусім не складваецца, што бывае даволі нярэдка, чалавек марыць, канешне, аб лепшым. І гэтая мара натуральная і апраўданая. Калі ж добра і вельмі добра ўкладваецца, таксама часцей за ўсё чалавек не да канца задаволены, бо яму да поўнага шчасця чагосьці яшчэ не хапае. А гэтае „чагосьці" проста бясконцае. Чалавек усё чакае і чакае гэтага лепшага і яшчэ лепшага — і верыць, што нарэшце прыйдзе яно, бо ён яго варты...

А тым часам гады незаўважна ўцякаюць і ўцякаюць ад яго. Апомніцца чалавек тады, калі акажацца, што ўжо няма калі чакаць, што ўсё асноўнае асталося па-за ім. І што гэтае найлепшае і найважнейшае ўжо было ў яго — асабліва маладосць і здароўе...

І так, малыя дзеці як найхутчэй хочуць быць вялікімі, дарослымі. Нават будуць есці нясмачную ім ежу, калі пераканаеш іх, што ад яе хутка вырастуць. Пра тое, што яны маленькія, і што такімі яшчэ доўга будуць, яны і слухаць не хочуць. Толькі адзін раз пачуў я ад свайго чатырохгадовага ўнучка Васілька што ён малы. Але гэта была экстрэмальная сітуацыя. А менавіта: атрымаўшы „кляпс" па попцы, канешне, заслужаны, ён доўга пакрыўджана паўтараў: „Kto to widział bić małe dzieci..."

Расце чалавек — і разам з ім растуць ягоныя патрэбы ды мары. А яны часценька бываюць няскромныя, навыраст. Традыцыйны спосаб здзяйсняння іх доўгі і нялёгкі. Вядзе ён праз пачатковую, сярэднюю, вышэйшую школы і завяршаецца набыццём адпаведнай прафесіі. Усё гэта, у сваю чаргу, патрабуе і пэўных здольнасцей, і таленту, і моцнай волі, і самадысцыпліны, і цяжкай працы, і матэрыяльных сродкаў. І гэта ў той час, калі вакол маладога чалавека кіпіць жыццё і калі яго акружае мноства спакус. Вось і не ва ўсіх хапае вытрымкі справіцца з усім гэтым. А са сваімі марамі расстаюцца ніхто не хоча...

Наступны парог, які ўзнікае перад маладым чалавекам, пераможна адолеўшым усе папярэднія, не будзе лягчэйшы ад папярэдніх. А менавіта: знайсці сабе адпаведную працу і адпаведную жонку ці мужа. Гэта дзве выключна важныя справы, і проста не ведаю каторая з іх важнейшая. Яны і астаюцца з чалавекам на ўсё ягонае дарослае жыццё.

Адпаведная праца — гэта такая праца, якую мы любім рабіць і ўмеем рабіць, праз якую мы можам самарэалізавацца. І, канешне ж, зможам сабе і сваёй сям'і запэўніць адпаведны матэрыяльны ўзровень жыцця. Падобна як справа з жонкай ці мужам: любіць, цаніць, дапамагаць, узаемарэалізавацца ды размнажацца...

І апошні этап — пенсія. Ужо ад пэўнага ўзросту, яшчэ ў працоўны перыяд, чалавек шораз часцей пачынае думаць пра адыход на пенсію, хаця спачатку і баіцца яе. І ёсць чаго баяцца — яна ж зусім змяняе нашае жыццё, расслабляе наш арганізм, усыпляе нашу пільнасць і чуткасць, дае мноства вольнага часу. І калі не сумееш разумна асвоіць яго, не знойдзеш сабе адпаведнага занятку, пенсія можа нават некарысна адбіцца на тваім здароўі. Некаторых пужае яшчэ і тое, што страцяць пэўную ўладу, пашану і пацерпяць у матэрыяльным плане. Аб'ектыўна, аднак, кажучы, пенсія — гэта проста ўніверсальны здабытак працоўнага чалавецтва. І кожны працоўны чалавек павінен пакарыстацца ёю. А хто першы прыдумаў і ўвёў пенсійную сістэму, той павінен атрымаць Нобелеўскую прэмію. Я штосьці не чуў пра такіх лаўрэатаў-нобелеўцаў...

Як бачым, кожны этап людскога кругавароту нясе ў сабе як мілыя, так і цяжкія сюрпрызы. Можна прайсці іх паспяхова, пераможна, але дзеля гэтага патрэбны тут немалы ўдзел, высілак і з нашага боку. Без поўнай самааддачы не будзе добрых вынікаў. І, канешне ж, трэба яшчэ мець хоць крыху шчасця... А можна і паслізнуцца і набіць сабе гузака, а то і спатыкнуцца, не дай Божа, на нейкім параграфе крымінальнага кодэкса. На жаль, такія няшчасці здараюцца не так ужо рэдка. І не толькі благім людзям...

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Аб патрэбе дыялогу

Адважуся сказаць, што адной з прыкмет добрай улады з'яўляецца тое як яна ўмее камунікавацца з грамадствам. І справа тут не толькі ва ўмеласці перадаваць — найчасцей шляхам СМІ — інфармацыю аб сваіх дасягненнях і намерах, але яшчэ да планаваных вырашэнняў тлумачыць чаму яны менавіта так вырашаюцца і што з іх вынікне, як добрае, так і благое. Гэтак вось я сабе раздумваў, калі беластоцкія чыноўнікі ў адно ранне паставілі краты на мастку ля вуліцы Фабрычнай, аддзяляючыя рынак ля Юравецкай вуліцы і далей распаложаную частку Беластока ад самога цэнтра горада. Гэта зроблена было знячэўку. Назаўтра „рука-нявідка" некалькі прэнтаў краты зліквідавала. У мясцовай прэсе працаўнік бюро... транспарту Гарадской управы тлумачыў:

— Па прычыне благога тэхнічнага стану на нейкі час мост зачынены для аўтамашын, а цяпер — для бяспекі пешых.

Міналі дні. Дзіра засталася і людзі праходзілі тудою, як праходзілі, адно што праціскаліся, лаючыся.

Праз нейкія два тыдні беластачане з Фастаў, Бацечак і Завадаў запратэставалі супраць пабудовы ў іх суседстве кантэйнераў для найбольш цяжкіх беластоцкіх кватарантаў. Уладары горада толькі тады пачалі размовы з патэнцыяльнымі суседзямі „падонкаў грамадства".

Абодва гэтыя выпадкі сведчаць аб праблемах улад Беластока з уменнем весці г.зв. грамадскі дыялог. Пры чарговых рашэннях раю ўзяць пад развагу словы Леха Антковяка — працаўніка кабінета мазавецкага ваяводы:

— Грамадскі дыялог, які вядзецца публічнай адміністрацыяй, павінен быць вынікам абдуманай уявы і стратэгіі. Не павінен быць ён выключна вынікам бягучых праблем, а асабліва ціску канфліктных сітуацый (...). Неабходным мінімумам грамадскага дыялогу лічыцца прэзентаванне грамадскай думцы падрыхтаваных прапаноў дзеянняў публічнай адміністрацыі з мэтай распазнаць грамадскія пазіцыі адносна гэтых прапаноў.

Думаю, што справа тут галоўным чынам у асцярожнасці ў навязванні рашэнняў, асабліва тых, якія датычаць штодзённага жыцця, такога вось як пераход праз масток ці пабудова кантэйнераў. І — на маю думку — самае найважнейшае, што дыялог павінен весціся да пачатку вырашэнняў. Пасля іх — гэта толькі папулізм. І тады нават (так як у выпадку пабудовы кантэйнераў) карэктура непапулярнага рашэння не паўплывае на тое, што грамадскасць будзе думаць пра ўладу як пра добрага дзядзечку.

У маім архіве трымаю канфідэнцыяльны тэкст аднаго з высокіх рангам самаўрадавых ваяводскіх чыноўнікаў аднаго з папярэдніх тэрмінаў. Досыць цынічна даносіць ён сваім начальнікам: „Гэта ўсё пагражае накапленнем праблем. Гаворка аб сітуацыі ў шпіталях і рэальнай пагрозе ліквідацыі большасці рэгіянальных чыгуначных перавозаў. У справе шпіталяў сітуацыю можа распаліць пратэст медсясцёр і іх прадбачваны візіт у Маршалкоўскую ўправу. Гэта можа быць відовішчная акцыя (тэлебачанне), у час якой вельмі лёгка можа трапіца нетактоўнасць. Папярэдні маршалак у ідэнтычнай сітуацыі паехаў на гарэлку ў Бабровую Даліну. Справа чыгуначных перавозаў не такая вельмі відная, ды з часам набярэцца значэння. Нядобра было б, калі б абедзве справы выплылі перад найбліжэйшай сесіяй сейміка, у час якой маюць быць прадстаўлены праграмныя тэзісы кіравання ваяводствам". І тут прыйшло мне ў галаву, што грамадскі дыялог ці не мае выключна на мэце ўтрымліванне добрага іміджу ўлады, хоць без сумнення гэтаму служыць. А напэўна не можа служыць адно ўтрымліванню сябе пры ўладзе.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

PS. Ужо пасля напісання тэксту у краце на мастку па вуліцы Фабрычнай паявілася спецыяльная брамка. Віншуем! Раптам нейкім цудам масток стаў бяспечным?

Як свет цікавіцца татарамі

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Калі каму здаецца, што татары беларусам зусім чужыя, пэўна не ведае нашай супольнай гісторыі. Лепш з ёю пазнаёміцца, каб ведаць чаму 16 жніўня ў падляшскія Крушыняны прыехалі тысячы людзей на І Фестываль культуры і традыцыі мясцовых татараў.

Ужо ў XIV стагоддзі татары спатрэбіліся ў армію князя Вітаўта. За службу Вітаўт надзяліў татараў зямлёю на абшары Вялікага Княства Літоўскага. Сяліліся яны тады навокал стратэгічных замкаў у Вільні, Троках ці Міры. Другая хваля сялення прайшла ў XVII стагоддзі. Дзякуючы рашэнням Яна III Сабескага паўсталі татарскія пасёлкі між іншым у Крушынянах, Багоніках, Нетупе ці Лужанах. Дзякуючы гэтым ведам або дзеля іх атрымання цікавыя татарскай культуры людзі з'язджаюцца з усёй Польшчы.

— Мерапрыемства мела трываць тры дні, — прызналася Джэнэта Багдановіч, арганізатар фестывалю. — На жаль, гэтая ідэя не знайшла адпаведнай колькасці прыхільнікаў і маем толькі два дні. Зразуменне прыйшло з Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства, але можа гэтае мерапрыемства пакажа, што культура татараў вартая дапамогі і іншых устаноў.

Джэнэта Багдановіч, арганізатарка фестывалю

Намеснік маршалка, які ўзяў голас у час адкрыцця фэсту, захапляўся ідэяй, падкрэсліваючы заангажаванасць улад у прамоцыю шматкультурнасці, асабліва культуры татараў, якая ў будучыні магчыма стане турыстычным „прадуктам". Але слова „прадукт" здаецца неадэкватнае для наведвальнікаў агратурыстычнай „Татарскай юрты", якую ў Крушынянах вядзе сям'я Багдановічаў. Ім былі смачныя перш за ўсё стравы татарскай кухні. Спецыялісткай па кухні з'яўляецца Джэнэта Багдановіч і, па шчырасці, з гэтай жа кухні ўсё пачалося. Перакачэўнік — гэта сімвал крушынянскіх татараў. Але ў час фестывалю можна было спаць бываць нашмат больш страў — былі плоў з баранінай, славуты перакачэўнік ці пярэмячы. Усіх гасцей разам з арганізатарамі вітала таксама прадстаўніца башкірскіх татараў з падносам поўным чак-чак — традыцыйнага салодкага, якое ў іхніх звычаях заступае наш хлеб ды соль. Можа і таму цэлае мерапрыемства было вельмі салодкае і каляровае. Адзін колер гэта напэўна татарская кухня і вопратка, якую прэзентавалі прыгожыя дзяўчаты і вядучы мерапрыемства беластоцкі акцёр Марэк Тышкевіч, можна сказаць, штатны канферансье Беласточчыны, які добра сябе адчувае ва ўсялякіх касцюмах. Татарская вопратка здавалася, аднак, быць больш бледнай пры індзейскім касцюме, які прэзентаваў Міраслаў Богуш, папулярызатар культуры індзейцаў на Падляшшы.

— Мы з Джэнэтай знаёмыя ўжо шмат гадоў, разам супрацоўнічаем у Таварыстве „Кнышынская пушча". Разам працуем у карысць прамоцыі рэгіёна. Я займаюся сваім індзейскім скансэнам, першым у Польшчы, які працуе ўжо дванаццаць гадоў, а Джэнэта — татарскай культурай. Мы дапамагаем адзін аднаму, — сказаў нам галоўны індзеец Падляшша.

У час фестывалю ён прэзентаваў свае ўмеласці і цудоўную вопратку. Не менш каляровымі паказаліся тыя, што акружалі галоўную юрту: вытворцы біжутэрыі, скураной галантарэі, якія вялі майстар-класы па сваім рукадзеллі, ці выканаўцы афрыканскай музыкі.

— У маёй крыві ў адной чвэрці плыве татарская кроў, — сказаў Гжэгаж Велізаровіч, сваяк Джэнэты. Сёння з Джоным, які ад трох гадоў жыве ў Польшчы, прывезлі мы традыцыйныя афрыканскія бубны, бо прафесійна займаемся гэтай музыкай.

Дзякуючы музыкам, можна было паспрабаваць сваіх рытмічных талентаў і сфатаграфавацца з чорнаскурым бубначом Джоным. На гэтым атракцыі не канчаліся, бо ў час, калі чарга да татарскай кухні разрасталася, побач на невялічкай сцэне прэзентаваліся барцы, а перад сцэнай гледачам паказвалі шоу, як падавалася, сапраўдныя шляхціцы. Супольных пунктаў татарскай культуры было больш. Няма татараў без коней, але і без мангольскага лука.

„Што зрабіць з вокам? Куды глядзець?" — пыталіся маладыя і старэйшыя ўдзельнікі фэсту, якія ўпершыню прабавалі страляць з лука. „Гэта не справа вока, а таго, як паставіць цела ў момант стрэлу", — адказвалі інструктары ў мангольскіх касцюмах. Да іх таксама выстраілася вялікая чарга. Аказалася, што ў гэтай чарзе стаяў таксама не адзін беларус. Няздзейсненыя гістарычныя мары?

Мары маладых людзей стараліся здзейсніць таксама жаўнеры, якія заахвочвалі да службы ў польскай арміі і паказвалі экстрэмальныя ўмовы, у якіх яны працуюць.

— Гэтае мерапрыемства не адбылося б без дапамогі мундзірных службаў, — удакладняе Джэнэта. — Перш за ўсё дзякуем надлясніцтву, побач якога прэзентавалася войска, а вайсковыя традыцыі ў гісторыі татараў таксама вельмі багатыя.

Аказваецца, што варта цікавіцца гісторыяй, якая напэўна дапаможа ў арганізацыі такога мерапрыемства — шматбаковага ды шматкультурнага — у будучым.

— Мне марыцца, каб у будучыні праз Крушыняны прайшоў каляровы, вялікі парад, у якім побач татараў ішлі б беларусы, літоўцы, украінцы — усе культуры, якіх прадстаўнікі стагоддзямі насяляюць Падляшша, — сказала Джэнэта Багдановіч.

Першы фестываль культуры і традыцыі польскіх татараў гэта аднак не першая сустрэча з татарскай культурай у Крушынянах. Ужо трэці раз падняпрэзентавалі прыгожыя дзяўчаты і вядучы мерапрыемства беластоцкі акцёр Марэк Тышкевіч, можна сказаць, штатны канферансье Беласточчыны, які добра сябе адчувае ва ўсялякіх касцюмах. Татарская вопратка здавалася, аднак, быць больш бледнай пры індзейскім касцюме, які прэзентаваў Міраслаў Богуш, папулярызатар культуры індзейцаў на Падляшшы.

— Мы з Джэнэтай знаёмыя ўжо шмат гадоў, разам супрацоўнічаем у Таварыстве „Кнышынская пушча". Разам працуем у карысць прамоцыі рэгіёна. Я займаюся сваім індзейскім скансэнам, першым у Польшчы, які працуе ўжо дванаццаць гадоў, а Джэнэта — татарскай культурай. Мы дапамагаем адзін аднаму, — сказаў нам галоўны індзеец Падляшша.

У час фестывалю ён прэзентаваў свае ўмеласці і цудоўную вопратку. Не менш каляровымі паказаліся тыя, што акружалі галоўную юрту: вытворцы біжутэрыі, скураной галантарэі, якія вялі майстар-класы па сваім рукадзеллі, ці выканаўцы афрыканскай музыкі.

— У маёй крыві ў адной чвэрці плыве татарская кроў, — сказаў Гжэгаж Велізаровіч, сваяк Джэнэты. Сёння з Джоным, які ад трох гадоў жыве ў Польшчы, прывезлі мы традыцыйныя афрыканскія бубны, бо прафесійна займаемся гэтай музыкай.

Дзякуючы музыкам, можна было паспрабаваць сваіх рытмічных талентаў і сфатаграфавацца з чорнаскурым бубначом Джоным. На гэтым атракцыі не канчаліся, бо ў час, калі чарга да татарскай кухні разрасталася, побач на невялічкай сцэне прэзентаваліся барцы, а перад сцэнай гледачам паказвалі шоу, як падавалася, сапраўдныя шляхціцы. Супольных пунктаў татарскай культуры было больш. Няма татараў без коней, але і без мангольскага лука.

„Што зрабіць з вокам? Куды глядзець?" — пыталіся маладыя і старэйшыя ўдзельнікі фэсту, якія ўпершыню прабавалі страляць з лука. „Гэта не справа вока, а таго, як паставіць цела ў момант стрэлу", — адказвалі інструктары ў мангольскіх касцюмах. Да іх таксама выстраілася вялікая чарга. Аказалася, што ў гэтай чарзе стаяў таксама не адзін беларус. Няздзейсненыя гістарычныя мары?

Мары маладых людзей стараліся здзейсніць таксама жаўнеры, якія заахвочвалі да службы ў польскай арміі і паказвалі экстрэмальныя ўмовы, у якіх яны працуюць.

— Гэтае мерапрыемства не адбылося б без дапамогі мундзірных службаў, — удакладняе Джэнэта. — Перш за ўсё дзякуем надлясніцтву, побач якога прэзентавалася войска, а вайсковыя традыцыі ў гісторыі татараў таксама вельмі багатыя.

Аказваецца, што варта цікавіцца гісторыяй, якая напэўна дапаможа ў арганізацыі такога мерапрыемства — шматбаковага ды шматкультурнага — у будучым.

— Мне марыцца, каб у будучыні праз Крушыняны прайшоў каляровы, вялікі парад, у якім побач татараў ішлі б беларусы, літоўцы, украінцы — усе культуры, якіх прадстаўнікі стагоддзямі насяляюць Падляшша, — сказала Джэнэта Багдановіч.

Першы фестываль культуры і традыцыі польскіх татараў гэта аднак не першая сустрэча з татарскай культурай у Крушынянах. Ужо трэці раз паднадворак перад „Татарскай юртай" адкрыўся для наведвальнікаў з цэлым сваім багаццем. Гаспадары таксама адкрытыя і на турыстаў, і на іншыя культуры, таму побач татарскай кухні можна было паспрабаваць шлёнскіх і чэшскіх прысмакаў ды падляшскіх страў з супрасльскай „Лукашоўкі". На панадворку паркаваў таксама грузавік, які звычайна ездзіць па вёсках у ролі крамы, у якой можна набыць хлебны квас, перац, а нават дэнатурат. Пры аўтакраме якраз стаяла чарга за напоямі, бо жара была невыносная. У спёку арганізатарам дапамагалі і скаўты, якія займаліся перш за ўсё дзяцьмі. Атмасфера была сямейная, сонечная, свабодная. Можна было пачуць тое, чаго шораз менш ва ўсялякіх мерапрыемствах: расслабленне, сяброўства, адкрытасць, без адмоўных эмоцый, з цікавасцю да свету.

Як у мінулым пад вянец ішлі

З ліку дзеючых на Беласточчыне лакальных культурных суполак Таварыства прыяцеляў Мельніцкай зямлі (ТПМЗ) вылучаецца не толькі актыўнасцю, але і высокім узроўнем прапанаваных мясцоваму грамадству ініцыятыў. І адбываецца гэта без дзяржаўных ці еўрасаюзных датацый – мерапрыемствы ТПМЗ гэта вынік сапраўднай актыўнасці яго членаў ды зычлівай падтрымкі жыхароў Мельніка і навакольных вёсак. Гэта спрыяе плённым пошукам дакументаў, здымкаў і іншых матэрыялаў аб мінулым гэтай зямлі і яе насельніцтва, што ў сваю чаргу з'яўляецца дасканалай крыніцай для распрацовак агульнейшага характару і публічнай іх прэзентацыі. Такі менавіта вось генезіс адкрытай апошнім часам у Мельніцкім доме культуры выставы з цыкла „Па слядах бацькоў нашых...", прысвечанай гэтым разам шлюбам і вясельным абрадам.

Адкрытая 12 ліпеня выстава „Na ślubnym kobiercu" („На шлюбным дыванку") паказвае дзесяткі старых і новых вясельных здымкаў мельнічан. Самыя старыя фатаграфіі паходзяць з 1920-х, найноўшыя – з 1990-х гадоў. Можна на іх прасачыць змены ў модзе на прыкладзе ўбораў маладой пары, заўважыць рост заможнасці насельніцтва... і павелічэнне колькасці алкаголю на вясельных сталах. Выставе спадарожнічае цікавы каталог, у якім паказана не толькі частка эскпанаваных фатаграфій, але і змешчаны ўспаміны ды расказ пра паасобныя фазы падрыхтоўкі да шлюбу. Галоўная ідэя выставы – захаваць памяць пра вясельную абраднасць на тэрыторыі Мельніцкай гміны ў XX стагоддзі. Сабраны матэрыял – пісьмовы і фатаграфічны – датычыць як праваслаўнай, так і каталіцкай абраднасці, паколькі гэтыя дзве рэлігіі выступаюць на гэтай тэрыторыі ў больш-менш роўных прапорцыях.

У каталогу змяшчаецца таксама кніга дашлюбных пратаколаў з заверанымі запісамі заключэння шлюбу з 1923-1940 гадоў. Гэта адзіная ўцалелая кніга з архіва мясцовай каталіцкай парафіі, які дзесьці прапаў пасля вывазу яго саветамі ў 1939 годзе.

Дзе мы жывём?

Шмат разоў я чуў, што палякі – хрысціянскі народ. Мабыць, але я пачынаю сумнявацца ў гэтым. Вось трапіла ў мае грэшныя рукі штодзённка „Dziennik Łódzki". У лодзінскай газеце пішацца больш-менш тое самае, што і ў беластоцкіх выданнях. Але мой зрок прыцягнула рэклама лодзінскіх пахавальных фірм. І ў гэты момант я засумняваўся ці гэтая газета выходзіць у хрысціянскай краіне, ці мо ў язычніцкай старажытнай Грэцыі. Бо на адзінаццаць аб'яў, аж у шасці фірмы названы па-элінску: Стыкс, Зеус, Гадэс, Алімп, Мінос, Харон. Апрача таго сустракаецца яшчэ Клепсідра, Прымус і СоПак. Гэтая апошняя назва больш мне асацыюецца з кур'ерскай фірмай, чым з пахавальным бюро. Як усё гэта разумець? А можа ў Лодзі жыве больш грэкаў, чым палякаў, якія Біблію замянілі „Міфалогіяй" Яна Парандоўскага? Да каго звярнуцца за высвятленнем справы? Мо да Курыі Лодзінскай дыяцэзіі?

М. Ц.

Клопат з ахоўным лесам

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Арлянская гміна менш аблесена чым суседнія. Гэта вынік наяўнасці буйных участкаў высакаякасных глеб для сельскагаспадарчага выкарыстання. Ды не толькі, бо нямногія яе жыхары зацікаўленыя аблясеннем сваіх угоддзяў, хаця шораз больш зямлі запускаецца. У прыродзе так складваецца, што калі чалавечая рука не кранае зямлі, дык яна хутка зарастае самасеем, найчасцей бярозай, вярбой і сасной. Большае аблясенне гміны магло б павялічыць яе атракцыйнасць. Надляснiцтва ў Бельску-Падляшскім падало ў арлянскую Гмінную раду заяўку, каб станоўча абмеркаваць прызнанне некаторых лясных абшараў ахоўнымі. Дагэтуль у Арлянскай гміне не былі ўстаноўлены прыродаахоўныя абшары кшталту нацпаркаў, прыродных ці ландшафтных запаведнікаў, абшараў ахоўваемага ландшафту, экалагічных угоддзяў ці прыродна-ландшафтных комплексаў. На пасяджэнні 26 чэрвеня г.г. рада адмоўна паставілася да згаданай прапановы надляснiцтва. З чаго ўзялося такое рашэнне?

У Арлянскай гміне знаходзіцца каля 12 800 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў, у тым ліку 1 870 га пад лясамі. У гміне лясы займаюць каля 12% абшару і гэты паказчык амаль утрая меншы ад ваяводскага (30%). У Арлянскай гміне дзяржаўныя лясы займаюць 52,3% усяго аблесенага абшару.

У залежнасці ад біятопу выступаюць тут лясы, бары і алёсы на падмоклых грунтах. Пераважаюць хвойныя дрэвы, асабліва сасна. Узрост лесу розны, але найбольш маладняку. Вялікіх суцэльных масіваў на тэрыторыі Арлянскай гміны няма; найбольшыя лясныя комплексы выступаюць каля вёсак Шчыты-Навадворы, Рудуты, Маліннікі, Рыгораўцы, Вулька-Выганоўская ды каля самой Орлі на месцы колішняй вёскі Вэрвэчкі. Найбольш лясоў захавалася ў падмоклых далінах рэк і на малаўраджайных глебах. Але апошніх мала, затое каля 70% ворных угоддзяў займаюць глебы III і IV класаў, а для зялёных угоддзяў гэты паказчык роўны 60%.

Меркаванне Гміннай рады аб вылучэнні лясоў у ранг ахоўных было абнародавана на пасяджэнні рады 26 чэрвеня, на якое быў запрошаны бельскі надляснiчы Ежы Анджэюк. Дзень раней, у час пасяджэння самаўрадавай камісіі, радныя і войт (як сам пазней прызнаўся) не ведалі ў чым сэнс захадаў надляснiцтва. Старшыня Рады Аляксандр Клін папрасіў надляснiчага праясніць сітуацыю; вось яго тлумачэнне:

— Дзяржаўныя лясы гаспадараць на аснове асобных для кожнага надляснiцтва дзесяцігадовых планаў устройства лясоў, зацверджаных міністрам. Адным з элементаў такога плана з'яўляецца план аховы прыроды і спіс ахоўных лясоў. Гэта звычайныя лясы, але з адмысловымі функцыямі, у сырых і балотных біятопах (водаахоўныя) ды даследчыя палеткі. Каб паслаць у міністэрства план, патрэбнае ў гэтай справе меркаванне гміннай рады. Яна не звязвае міністру рук, але хоча ён пазнаёміцца з поглядам самакіравання. На тэрыторыі Арлянскай гміны мы падалі 271,55 гектара дзяржаўных ахоўных лясоў, з чаго 90% складаюць водаахоўныя лясы, ды тры даследчыя палеткі, м.інш з піхтой (яна пад пагрозай) і дубам. У заяўцы надляснiцтва ў гміну была просьба папоўніць лакалізацыю, але на тэрыторыі гміны яна не супадае з абсягам геадэзічных працэдур; дзеля плана праводзяцца геадэзічныя і глебазнаўчыя працы.

Ахоўныя лясы не ўвядуць ускладненняў, бо яны ў Польшчы даступныя насельніцтву. Ахоўныя лясы вызначаюць леснікам меры гаспадарання ў іх. Яны не ўскладняюць гміннай гаспадаркі і можна іх лічыць карыснымі мясцоваму грамадству, — надляснiчы Ежы Анджэюк папрасіў станоўча паставіцца да заяўкі надляснiцтва.

Надляснiчы Ежы Анджэюк паказвае радным размяшчэнне дзяржаўных лясоў у Арлянскай гміне

Віцэ-старшыня Гміннай рады Антон Голуб заўважыў:

— Калісь Падляшша было пад лесам, пасля людзі яго высеклі, а цяпер усё ідзе ў адваротным напрамку — нават на тыповых сельскагаспадарчых угоддзях ёсць лясы. Ці не лічыце, што пачынаем кідацца з крайнасці ў крайнасць?

— Скажу толькі, — адказаў надляснiчы, — што пад лесам зямля не псуецца.

— Ці ў ахоўным лесе забаронены высечкі? — спытаў старшыня Рады Аляксандр Клін.

— Не выконваюцца толькі адкрытыя высечкі, — адказаў надляснiчы.

— А калі Рада адмоўна паставіцца да Вашай заяўкі? — пацікавіўся радны Марцін Кубай.

— Мяркую, — адказаў спадар Анджэюк, — што пагроз гміне няма. Тут большасць складаюць маладыя лясы, 40-гадовыя. За 10 гадоў можна прыняць іншую пастанову.

Я пацікавіўся, як выглядае аблясенне нашай гміны на фоне суседніх і ці ў нашай гміне паяўляюцца зубры.

— Аблясенне Бельскай гміны гэта 25%, Чаромхаўскай, Кляшчэлеўскай і Дубіцкай — каля 50%, найменшае — у Чыжоўскай — 8-9%. Пад аблясенне прызначаюцца непрыгодныя грунты. Лясы, палі і фармаванне краявіду ўзбуйняюць атракцыйнасць гмін.

Зубры прабываюць у Арлянскай гміне ўжо ад некалькіх гадоў. Я ў Бельску ўсім гавару, што найбліжэйшыя зубры ў Орлі. Нам, у лесе, яны нявыгадныя, бо — хаця навокал шмат палёў і лугоў — у меню зубра і лясны матэрыял. Зубры наносяць лесу вялікія шкоды, але пакуль тут зуброў мала і справа з імі ніштаватая.

— Калі Рада паставіцца станоўча да прапановы, то ці гміна ад гэтага не страціць? — спытаў Антон Голуб.

— Надляснiцтва ад гэтага не выйграе, такое патрабаванне закону, — адказаў надляснiчы. — Калі не будзе плана аховы прыроды, тады міністр не адобрыць нашай ініцыятывы. Надляснiцтва не мае дачынення да баброў ці зуброў, бо гэтая звярына пад аховай і магчымыя кампенсацыі плаціць ваявода.

— Можа больш канкрэтна, пра падатак, — папрасіў старшыня Рады Аляксандр Клін. — Бо калі лясы атрымаюць статус ахоўных, тады надляснiцтва плаціць палову падатку.

— Гэтым лясам менш сарака гадоў, — заўважыў надляснiчы.

— А што будзе, калі да майго статка кароў далучыцца зубр? — пацікавіўся спадар Голуб.

— Тады трэба званіць у Белавежскі нацпарк, а там намеснік дырэктара спадар Дацкевіч гэтым зоймецца і будзе інтэрвенцыя.

— Усе ведаюць, — дадаў Антон Голуб, — што кароў трэба даіць праз кожныя 12 гадзін. І пакуль нехта з Белавежы прыедзе, будзе ўжо па тэрміне і будуць страты.

— Я гэта разумею, але не магу пры тым нічога дапамагчы. Сялян, што гаспадараць бліжэй пушчы, гэта яшчэ больш раздражняе, — адказаў надляснiчы, а старшыня Рады падзякаваў яму за прысутнасць на сесіі.

Калі надляснiчы пакінуў пасяджэнне, голас узяў войт Пётр Сэльвесюк:

— Пасля візіту надляснiчага б'юся з думкамі. Ён адкрыта не сказаў таго, што я спадзяваўся ад яго пачуць. Вось, на тэрыторыі нашай гміны Надляснiцтва мае 466,45 га лясоў і ў сваёй заяўцы хоча палічыць ахоўнымі 271,55 га, значыць больш паловы. Дагэтуль 459,33 з тых 466,45 гектараў былі звычайным лесам, а ахоўнага было толькі 7,12 га дык прапанаваная змена была б значная. І найважнейшае — за гектар ахоўнага лесу маем 16,2 зл. падатку, а за звычайны лес 32,4 зл. Вось за 466 гектараў яны плацяць 14 998 зл. у год, а калі гэты абшар паменшаем у карысць ахоўных лясоў, тады паменшае і падатак на прыблізна 60-70%. Пра гэта надляснiчы не сказаў — можа забыў, можа не хацеў сказаць. Гэта важная інфармацыя, бо ў прынцыпе змены, апрача фінансавання, не будзе — яны будуць плаціць у гміну на 7-8 тысяч злотаў менш. Рашэнне за раднымі, хаця яно не звязвае міністру рук, — заявіў войт.

У выніку галасавання рашэнне не было прынята. А што вырашыць міністр, пакажа час.

Жніво з фальклорам

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

IV Падляшска-Палескія жніўныя сустрэчы „Олень по бору ходіт”, якія з 8 па 10 жніўня праходзілі ў міжнароднай кампаніі ў Студзіводах, Крыўцы, Відаве, а закончыліся ў Бельску-Падляшскім у час „Спасаўскіх запустаў”, распачаліся жніўным карагодам, што выйшаў з-пад хаты ініцыятара спатканняў Дарафея Фіёніка. Арганізатары мерапрыемства — сябры Аб’яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах” — хацелі захаваць традыцыю, калі жніўныя песні спяваліся дзяўчатамі, сабранымі на лавачках пасля цяжкай працы з сярпом у полі вечарам, а то і ноччу буднямі і ў святочныя дні, калі было больш вольнага часу. Можна сказаць, што ў невялікіх Студзіводах пятніца спачатку была працоўным днём, а пасля з-за шматлікіх спеваў, танцаў і іншых выступаў стала вялікім святам.

„Малінкі” вучылі жаць бельскую моладзь і дзяўчат з „Ільінскай пятніцы”

Знатакі фальклору і яго любіцелі прыбылі на святкаванні загадзя, разам з журналістамі шматлікіх масмедыяў, каб паглядзець жніўныя абрады ў натуральных абставінах. Карагод жанчын і мужчын у народных касцюмах суправаджаўся жніўнымі песнямі. Неслі яны калыску з малым дзіцём (лялькай), кветкі для прыбрання „перапяліцы”, а ў большасці ў руках былі сярпы, каб жаць авёс, што красаваўся на Фіёнікавым полі, побач вялікага жыта.

Работа, як у мінулым, распачалася з малітвы, якую, стоячы на каленях, гаварылі жанчыны з пінскай вёскі Сташаны. Выступілі яны на полі з найбольш поўным жніўным абрадам: жалі пад жніўныя песні і прымаўкі. Падрыхтавалі яны таксама кветку на „перапяліцу”, а калыску з лялькай развесілі на кіях, так як у мінулым. Старэйшае дзіцё займалася калыханнем. На полі быў і „наглядчык”, які расстаўляў жанцоў, а пасля клапаціўся, каб найбольш стомленыя маглі напіцца свежай вады. Увагу публікі прыцягнуў таксама вельмі прыгожы і галасісты спеў ды расказы пра жніўныя абрады калектыву „Арэшкі”, спявачкі якога жалі побач жанчын з Піншчыны. Звярнулі яны ўвагу на змест жніўных песень, у якіх часта паяўляўся матыў цяжкай працы на панскім полі.

Жанцы з Маліннік і Віталій Соха з Тапароў, што выступае з „Малінкамі”, былі расстаўлены на полі ў якасці інструктараў майстар-класаў па працы з сярпом. Вучылі яны бельскую моладзь і членаў калектыву „Ільінская пятніца” з Рыгі як правільна жаць. Спявалі яны ў галоўным па дарозе ў поле і дамоў.

— За нашай маладосці жніўныя песні часта спявалі мы ў нашым садзе і на насыпе, куды апрача моладзі з Маліннік сыходзіліся маладыя людзі з Тапароў, Шарнёў і Рудутаў, — сказала Вера Нічыпарук з „Малінак”, якія нядаўна адзначылі дзесяцігоддзе сваёй дзейнасці.

Жніўныя песні на полі Дарафея Фіёніка спявалі таксама моладзь з Бельска, з „Ільінскай пятніцы” і маладыя жанчыны з вёскі Хмелева, што пад Жабінкай, вядомай у Беларусі з-за мужчынскага манастыра. Служыць там іераманах Серафім, да якога за малітвамі і парадамі едуць таксама шматлікія паломнікі з Беласточчыны. Напэўна прэзентацыя аўтэнтычнага фальклору сярод зажатага аўса ўспрымалася сабранымі зусім інакш, чым выступы на сцэне, якія распачаліся пазней.

— Большае колькасць замежных калектываў на нашых жніўных сустрэчах і я думаю, што чарговыя, пятыя спатканні будуць ужо міжнародным фестывалем жніўнага фальклору. У выпадку жніўных выступаў на полі хочам трымацца толькі аўтэнтычнага і неапрацаванага фальклору беларусаў Падляшша і пінскага Палесся і не пашыраць рэпертуару па-за гэтую катэгорыю. У згаданыя песні якраз добра ўпісваецца і „Ільінская пятніца”, — заявіў старшыня Аб’яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах” Дарафей Фіёнік. На поле выйшлі ж ужо спевакі з трох краін — Польшчы, Беларусі і Латвіі. Прыгадаю, што названне сустрэч „Олень по бору ходіт” узятае ад першых слоў традыцыйнай жніўнай песні падляшскіх беларусаў, якую спяваюць удзельнікі мерапрыемства.

Вельмі добра, што, апрача членаў запрошаных калектываў, іншыя ўдзельнікі спатканняў маглі паспрабаваць жаць авёс. Вялікую частку сабраных на полі складалі маладыя людзі, якія толькі ў папярэдніх выпусках студзіводскага мерапрыемства маглі сутыкнуцца з працай з сярпом, скручваннем перавяслаў і вязаннем збожжа ў снапы. Аднак можна было меркаваць, што большасць маладых жанцоў толькі ўпершыню сутыкнулася з сярпом, таму і вучоба мусіла распачынацца з асноў. Заўважыў я, што моладзь вельмі хутка вучылася жаць.

Праца на полі ў Студзіводах з’яўляецца і цікавым вяртаннем да традыцыі, і зручнай прычынай для прэзентацыі жніўнага фальклору, даўніх песень, якія, незапісаныя, зніклі б назаўсёды. А расказваюць яны пра цяжкую працу ў полі ў час жніва, якая прыносіла таксама радасць, бо змалочанае збожжа давала асноўнае харчаванне ўсім сямейнікам і корм жывёле на ўвесь год. Збіральнікі народнага фальклору, сярод якіх вылучаюцца супрацоўнікі Студзіводскага музея, карыстаюцца рознымі нагодамі, каб папоўніць свой рэпертуар даўнімі песнямі і танцамі. Майстар-класы праходзілі таксама і перад жніўным мерапрыемствам у Рудутах і Студзіводах, а моладзь з „Жэмэрвы” разам з членамі „Ільінскай пятніцы” збіралі фальклор, вучыліся старым танцам і спяванню даўніх песень. Маладыя людзі мелі нагоду прайсці з Рудутаў у Тапары, спяваючы па дарозе жніўныя песні, што паводле Дарафея Фіёніка можна ўжо лічыць інаўгурацыяй жніўных сустрэч. Выступілі яны ў Тапарах з народнымі танцамі і нават бура з дажджом не напалохалі маладых спевакоў і танцораў.

— Жывучы ў Рудутах, мы збіралі фальклор Пашкоўшчыны, Маліннік і Грабаўца, а моладзь удасканальвала свае танцорскія ўмеласці. У час студзіводскіх майстар-класаў мы вучыліся жніўным песням з Дабрывады і Дзяменіч, — растлумачыла кіраўнік „Жэмэрвы” Анна Фіёнік.

Удзельнікі студзіводскіх сустрэч пасля змагання з аўсом вярнуліся ў музей, каб і там паспяваць. Не рабілі гэтага на лавачках, як у мінулым, але на сцэне, бо паслухаць іх спеваў прыйшла ж публіка. Пасля салістаў выступілі „Арэшкі”, „Малінкі”, „Жэмэрва” супольна з „Ільінскай пятніцай” і „Антракт” Бельскага дома культуры. Мала аўтэнтычнага фальклору было ўжо ў выступах гасцей з Беларусі, якія развесялялі публіку з нагоды 10-гадовага юбілею шлюбу Дарафея і Альжбеты Фіёнікаў, пра што памяталі сябры і знаёмыя, якія прыйшлі на спатканне з кветкамі і падарункамі. „Чабатухі” са Сташан падарылі юбілярам традыцыйную калыску з пажаданнямі калыхаць у ёй праз год дзяўчынку (зараз у Альжбеты і Дарафея двух сыноў). „Хмелеўскія валацугі” і жанчыны са Сташан апрача вясёлых песень падрыхтавалі таксама гумарыстычныя расказы, гульні і ўдала захвочвалі публіку да танцаў.

9 жніўня разам з удзельнікамі жніўных сустрэч у Асяродку праваслаўнай культуры „Светласць” у Крыўцы выступілі іншыя выканаўцы. Госці з Беларусі 10 жніўня выступілі ў Відаве, Вэрстоку, а ў час „Спасаўскіх запустаў”, што ладзіліся таксама ў гэты дзень у гарадскім амфітэатры ў Бельску-Падляшскім, калектывы мелі ўжо нагоду выступіць перад масавай публікай. „Спасаўскія запусты” — адно з самых вялікіх беларускіх мерапрыемстваў, ладжаных у Бельску. Заваявала яно прыхільнасць бяльшчан з-за добрай арганізацыі, за якой наглядае дырэктар Бельскага дома культуры Сяргей Лукашук (Павятовы аддзел БГКТ з’яўляецца суарганізатарам гэтага мерапрыемства), і адпаведна падабранага да масавых выступаў рэпертуару. Аўтэнтычны фальклор, апрацаваныя даўнія песні і эстрадны беларускі рэпертуар маюць у Бельску сваіх верных аматараў. Кірмаш з ласункамі прыцягнуў перш за ўсё дзетак. У гэтым годзе перад бельскай публікай у час XIV Спасаўскіх запустаў выступілі таксама калектыў „Неруш” з Мінска, бельскія „Маланка” і „Васілёчкі”.

Адно ашуканства

У кастрычніку 2002 года быў заснаваны Фонд працоўнай уласнасці ПКП — Спецыялістычны інвестыцыйны адкрыты фонд (SFIO). Мэта згаданага фонду — забяспечыць непасрэдны ўдзел у прыватызацыі дзяржаўнага чыгуначнага прадпрыемства і гарантаваць карысць ад яе асобам, якія працуюць або працавалі на чыгунцы. Кожнаму працаўніку дзяржаўнай чыгункі, у тым ліку і пенсіянеру, былі прызначаны „адзінкі ўдзельніцтва” (jednostki uczestnictwa). Трэба адзначыць, што вартасць „адзінкі” ў момант заснавання фонду была ацэнена на 2,24 зл., а працаўнік мог атрымаць не больш чым 14 „адзінак” (у залежнасці ад стажу працы). Мінула пяць год і многія, мабыць, забыліся аб сваіх „акцыях”, як грымнула вестка, што зараз за акцыі чыгунка плаціць вялікія грошы. Сябры-аднавяскоўцы гурбой паваліся ў Беласток за грашыма, але дамоў вярталіся з апушчанымі насамі. „З вялікага гуку, не было што браць у руку” — так можна пракаментаваць іхную паездку. Паасобнаму пенсіянеру выплачвалі па... 150 зл., прычым доўга намаўлялі, каб не забіраць грошай, бо „адзінкі” яшчэ падаражэюць.

Але людзі не вераць банкавым канторшчыкам, бо гэтыя ў зман іх зводзяць. Банк выплачвае грошы за прад’яўленым асабіста дакументам. Нікому іншаму. Пасля смерці працаўніка ці пенсіянера ніхто з сямейнікаў не атрымае ніводнай капейкі. Вось як справа маецца! Кажуць, што ў заходніх краінах пасля смерці чалавека страхавая фірма шукае сямейнікаў нават за мяжой, каб выплаціць кампенсацыю.

Уладзімір СІДАРУК

Бяда з каровамі

У аўторак раніцай 24 чэрвеня гг. пайшоў быў бялоцкі солтыс падаіць кароў, бо ў той дзень была яго чарга адвезці малако на пункт скупкі ў Трасцянку. Калі зайшоў за стадолу, дзе ягоныя каровы былі ўшпіленыя на ланцугі, убачыў, што не хапае аднае каровы, найпрыгажэйшае. Мела яна цяліцца 15 ліпеня.

Солтыс папрасіў брата, каб пашукаў карову і вярнуў яе да статка, а сам павёз малако ў Трасцянку. Брат узяў ровар і рушыў шукаць прапажу. Аб’ездзіў шмат месцаў, ды нідзе цельнай братавай каровы не было. Вяртаючыся дамоў, 300 метраў ад вёскі , пры жвіраванай дарозе з вёскі Бялкі ў Агароднікі ўбачыў галаву, ногі, кішкі і нежывое цялятка. Пазваніў у павятовую камендатуру паліцыі ў Гайнаўку. Прыехалі следчыя паліцыянты — двое мужчын і жанчына, распыталі пра справу і выклікалі калегу з паліцэйскім сабакам. Сабаку прывезлі на „паланезе”. Убачыўшы ката на бялоцкай вуліцы, той сабака ўсчаў такі вэрхал, што, калі б выпусцілі яго на вуліцу, кот уміг не застаўся б у жывых. Каля 10 гадзіны заехалі на месца злачынства. Там знайшлі яшчэ сякеру і сляды самахода. Ацанілі, што злачынства ўчыніў нейкі партач, а не „фахман”. А сабака не ўчуў слядоў — адбылося ўсё пры жвіраванай дарозе, на якой праязджаючыя самаходы зацерлі сляды.

Было такое некалькі гадоў таму ў суседніх вёсках, але ў нашай такое здарылася ўпершыню! Такая страта для гаспадара! І невядома, ці ўдасца паліцыі ўстанавіць і злавіць злачынцу. Пільнуйма лепей сваіх кароў, не пакідайма іх на лугах нанач!

Мікалай ЛУК’ЯНЮК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

„Нянавісць” за школьнай партай!

— А мне ўжо захацелася ў школу, — заявіла наша рэдакцыйная сяброўка Патрыцыя, — надакучыла адпачываць!

Сапраўды, у канцы жніўня хочацца ўжо ў школу. У сонечных галоўках многа спадзяванняў і планаў. Каб назбіраць як найбольш добрых ацэнак, прачытаць як найбольш кніжак, падцягнуцца ў беларускай, ангельскай ці нямецкай мовах. Вядома, найбольш спадзяванняў у першакласнікаў — у наймалодшых і тых старэйшых. І чамусьці найбольш хочацца сустрэцца з сябрамі.

Дзесяцігадовая Патрыцыя найбольш сумуе па сяброўках Элі і Магдзе.

— Я ненавіджу хлопцаў! — заяўляе дзяўчынка.

— А можна ведаць чаму? — падпытваем у Патрыцыі.

— Бо яны абкрадаюць сваіх старэйшых сястрычак!

Патрыця, як і ўсе яе класныя сяброўкі, вымушаная сядзець за адной

партай з жулікаватым хлопцам. І найгорш, што яе сябра Сярожка такі маўчун. Бывае, за цэлы дзень не адазвецца да яе словам. Патрыцыя доўга думала, што абазначае ягонае маўчанне. Адказ прыйшоў нечакана. Аднойчы ў сваёй сумцы дзяўчынка знайшла перламутравы пярсцёнак і бранзалет. У першы момант яна падумала, што памяняла свой рукзак з нейкай гімназісткай. Сапраўды, знойдзеная ёю біжутэрыя магла прыналежаць толькі старэйшай дзяўчыне. Наша сяброўка спачатку шукала ўласніцы пярсцёнка і бранзалета сярод класных сябровак. Аднак у класе ўсе толькі паціскалі плячыма. Настаўніца таксама не ведала што сказаць. Ды і Сярожка традыцыйна маўчаў!

— Тады я рашыла паказаць пярсцёнак і бранзалет Асі, — смяецца Патрыцыя, — старэйшай сястры Сярожкі.

— Адукуль у цябе мае рэчы? — здзівілася гімназістка.

Патрыцыя сказала, што сядзіць за адной партай з яе братам. І нават папрасіла прабачэння за яго.

— Я не ведаю што сказаць, — усміхнулася Ася. — Я думаю, што вас мусова рассадзіць!

— І вельмі добра, — адказала ёй малая, — я ж нененавіджу хлопцаў!

ЗОРКА,
Фота Ганны КАНДРАЦЮК

„Катрынка” на адпачынку

Гэтым летам з 27 ліпеня па 4 жніўня калектыў педагогаў і гурткоўцаў узорнага клуба аматараў фальклору „Катрынка” Высокаўскага цэнтра пазашкольнай работы адпачываў у Кляшчэлях. Размясцілі нас у новым будынку цэнтра турыстыкі і культуры „Гладышка”, які быў афіцыяльна адкрыты 26 ліпеня 2008 г. Кожны дзень побыту ў Польшчы быў запоўнены цікавымі праграмамі, гульнямі, заняткамі сумесна з вакальнымі групамі „Мікстура” і „Фантазія” з Кляшчэль, дыскатэкамі. Дзеці адпачывалі на пляжы адкрытага басейна, гулялі ў валейбол, купаліся, загаралі.

Былі арганізаваны экскурсіі ў Беласток і на Святую Гару Грабарку. На заліве Рэпчычы дзеці і дарослыя каталіся на катамаранах, маторнай лодцы, а самыя смелыя — на байдарцы.

Калектыў клуба наведаў выставы: мінералаў — Мікалая Падлашчыка, жывапісу — Барбары Александровіч, разьбы па дрэве — Славаміра Смыка, археалогіі — Адама Ваўрусевіча, летапісаў пажарных дружын.

Калектыў „Катрынка” не толькі знаёміўся з мясцовым фальклорам, але і выступіў са сваімі канцэртамі ў Нурцы, Кляшчэлях, Дабрывадзе, Гайнаўцы і Дашах.

У пятніцу, 1 жніўня, нашы дзеці з педагогамі прысутнічалі на адкрыцці крыніцы і экалагічнай сцяжынкі ў Дабрывадзе. Адкрыццё пачалося паказам мыцця бялізны ў рэчцы дабрывадскай старажылкай і прадоўжылася шпацырам па экасцежцы вакол рэчкі.

На фальклорным фесце ў Дашах „Што нам у душах грае — лета з традыцыяй”, які адбыўся 3 жніўня, калектыў „Катрынка” атрымаў дыплом I ступені.

Мы ўдзячны дырэктару Дома турызму і культуры г. Кляшчелі Марыі Клімовіч і дырэктару Гайнаўскага дома культуры Андрэю Скепку за гасціннасць і добрую арганізацыю нашых выступленняў у Польшчы.

Вялікі дзякуй мэру г. Высокае Леаніду Біруку і бурмістру г. Кляшчэлі Аляксандру Сяліцкаму, якія падпісалі Дэкларацыю прыгранічнага супрацоўніцтва, дзякуючы якому калектыў „Катрынка” так цікава адпачыў у Кляшчэлях.

Людміла ДУДАР

Міра ЛУКША

Жук з Жукоў

Жук Жучкевіч у чорным фраку
Не палез бы ў гэту драку,
Бо ён той касцюм шкадуе,
Ды абразы не даруе!
Шабляй ён махае спраўна,
Рыцар Жук у свеце слаўны!

З абы-хамам ваяваць?
Каб свой гонар даказаць?!
Бараніў ён гонар дамы,
Бо Жук — рыцар ёй адданы.
Выбіў зуб ён на таку
Каларадскаму жуку,
Што кароўцы брыдкасловіў,
Божай! А цяпер ляжыць у саломе;
Больш не будзе дам чапаць,
Зуб ад Жука ратаваць!

Музыка з кайфам

Што паўстае з „Брагі”?

Дзецям пра брагу расказваць зарана нельга, але калі ў вас ёсць жаданне даведацца, што абазначае слова брага — спытайце ў бацькоў. Я пакуль што скажу пару слоў пра „Рок-фармацыю Брага”, бо вакол яе стварылася легенда.

Пачаткі гурту сягаюць 1994 года. Гарадок, буйныя падзеі першых гадоў дэмакратычнай III Рэчы Паспалітай, актыўная дзейнасць Лёніка Тарасэвіча (паводле некаторых нават звышактыўная, але жыццё паказвае, што звышактыўных усё ж такі ў нас мала). У такіх умовах нараджаўся фермент, які ў канцы канцоў апынуўся на сметніку. І хаця сметнік гісторыі вялікі, то з гуртом „Р.Ф. Брага” тая ж гісторыя абышлася ласкава. Незразумела? Паспрабую расказаць па-іншаму.

На календары 1994 год. Па інспірацыі і адначасова пры вялікай дапамозе Лёніка Тарасэвіча паўстае гурт „Р.Ф. Брага” — з’ява, якая задзівіла перш за ўсё ўвесь беластоцкі музычны свет. Як на гэты час, гурт меў выдатныя ўмовы, доступ да класных інструментаў, гукавога абсталявання, магчымасць рэпетыцый у доме культуры і ў спецыяльна нанятым доміку. На хвалі буйнога развіцця рок-музыкі ў 1990-х гадах „Р.Ф. Брага” запоўніла сваю музычную прастору хардкорам і небанальным жорсткім тэкстам, які проста паказвае жыццё, прытым тэксты гурту ствараліся доўга, пад вокам не адной асобы, таму яны так важныя і так трапныя. Музыка і тэксты гэта адно, але ёсць таксама і іншыя сімвалы, з якімі „Брага” асацыюецца. Першы — славуты сметнік, на якім зроблены здымак гурту; другі — напэўна загаловак альбома „Сляпы”, які даслоўна кажа нам адкрыць вочы; чарговым можа быць аранжавы колер, які быў прыдуманы для графічнага афармлення канцэртаў: вопратка, надпісы на кашульках, сцэнічнае афармленне. Усё вакол гурту было дакладна прадуманае: ад значэння кожнага слова па ўсе моманты прамоцыі. „Брага” спявала калісь пра шызафрэнію, але нельга аднесці гэтага да самога працэсу стварання так добрага гурту.

Паводле некаторых ацэнак, гурт быў дасканалым прадуктам, аднак, разглядаючы канчаткова цэлы кантэкст, здаецца, пад гэтай упакоўкай знойдзем вельмі блізкі нам пераказ, знойдзем крык маладых людзей, якія чакалі рэакцыі. Некаторыя, мабыць, чакаюць і да сёння. Паслухайце іхні голас.

i_basovka@o2.pl

Алян з мамай Ганнай і бабуляй Зінай Туронак

ГІСТОРЫЯ ПРА МАГІЧНАСЦЬ БЕЛЫХ КАМЕНЬЧЫКАЎ

...А яшчэ не забывайце, шаноўныя мае, што і падарункі бываюць розныя. Бываюць вялікія і даволі дарагія. А бываюць на выгляд не надта буйныя і важкія, але затое каштоўнейшыя за любую каштоўнасць.

Вось і Зенік адным цудоўным надвячоркам падараваў мілай сваёй Жанулі невялічкі белы каменьчык. Звычайны такі каменьчык, толькі крышку кругленькі і з акуратнай чорнай кропкай пасярэдзіне. Аднак! Гэта ён толькі здаваўся такім звычайным.

— На самай справе гэты каменьчык магічны і зачараваны, — усміхаўся Зенік, укладваючы дзяўчыне ў далонь свой падарунак.

— Сапраўды?! І... што ж ён можа? — не хавала цікавасці ў сваіх бяздонных вачах дзяўчына.

— Сёння вечарам ты ўведаеш. Толькі не выпускай яго з рук, калі будзеш класціся спаць.

Так яно і здарылася. Не паспела Жанулька заціснуць у далоні белы каменьчык, перад тым, як данесці голаў да начной сваёй сяброўкі — падушкі, як раптам ейны мабільнік ажыў, прымаючы эсэмэску. Гэта было — якая радасць! — спавяшчэнне ад Зеніка. „Дабранач для самай цудоўнай ва ўсім свеце дзяўчыны”.

І дагаралі штодня вечары, і штовечар зацiскаўся магічны каменьчык у дзявочай руцэ, і даляталі, пульсавалі, краналіся пяшчотна шчочак і вуснаў такія чаканыя і такія добрыя эсэмэскі: „Салодкіх сноў...”, „Аксамітнай і зорнай ночы...”, „Засынай, мая ластаўка...”, „Усміхніся і спі ў рамонках...”, „Закалыхваю маю дзяўчынку...”

Вось толькі аднойчы (і як магло такое надарыцца?!) дзяўчынка згубіла той дзіўны, той мілы каменьчык. Нідзе не магла знайсці яго: ні ў хаце, ні ў двары, ні ў ложку. Цэлы дзень прайшоў у пошуках. А вечарам з лёгкім адчаем яна расчасала залацістыя свае коскі, паправіла ямчэй падушку і ўжо хацела, самотная, праваліцца ў бяссільны сон, як раптам...

Пераканаўча і ярка замільгацела вакенца ў дзявочым мабільнічку, і шчаслівыя вочы Жаначкі прачыталі: „Самыя яркія зорачкі — для цябе, мая цёплая ночка”.

І была тая ночка для яе не толькі самай цёплай, а яшчэ самай казачнай і пяшчотнай.

А калі яна скончылася, і ў акно асцярожна зазірнуў ды ўсміхнуўся ранак, Жануля прачнулася. Прачнулася, моцна зацiскаючы ў руцэ акуратны белы каменьчык. І быў ён цёплым і казачным, як мінулая ноч. Як і ўсе мінулыя, як будучыя ўсе ночы...

Ваш Дзядзечка Сід

13 жніўня 2008 г., Кобрын

Вершы Віктара Шведа

Разумны і дурны

Задумоўваюцца дзеці,
Гэта было цікава ўсім,
Якая розніца на свеце
Паміж разумным і дурным.

Разумны мае думак
столькі,
Што часу мала да размоў.
Дурны балбоча ўсё без
толку,
Думак няма, пустых
шмат слоў.

Новы сабака

Да сябра дарагога Лёні
Пазваніў раптоўна Якаў:
— Прашу прыйдзі
да нас сёння,
Купілі новага сабаку.

— А ён мяне не пакусае?
Яму ж зусім я незнаёмы.
— А гэтага яшчэ не знаем,
Пакуль нам гэта невядома.

Польска-беларуская крыжаванка № 34

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 30: Прынц, шолах, Канада, кароль, ар, каралі, вока, марш, вуха, марш, ер, султан. Пік, кавун, гарох, рака, кола, шалі, конь, мел, ла, гарт, рада, харашун.



У інфармацыйным ландшафце Украіны прысутнічае толькі ўкраінская мова — без ніякіх прымешак, без ніякай трасянкі. Тамашнія ўлады пакідаюць свайму народу ўсё ягонае спадчыннае багацце — матэрыяльнае і духоўнае. І моўная спадчына, як кроў і дасягненні продкаў, там у пашане...

КРАЙ САКРУМ

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

„І паведамі людзей пра паломніцтва; яны прыйдуць пяшком і на ўсялякай худобе па ўсялякіх пуцявінах, каб сведчыць пра карыснае і ўсхваляць імя Алаха...” Гэтак заклікае 28-ы аят 22-й суры Карана „Паломніцтва”. Не ведаю, ці ўдзельнікі розных сучасных пілігрымак гэтак жа асэнсоўваюць іх — універсальную, здаецца — мэту. Бо яшчэ трэці аят той жа суры заўважае, што „сярод людзей ёсць такія, якія прафанна спрачаюцца пра Алаха — і цягнуцца за ўсялякімі падшэптамі сатаны”. Здаўна вядома, што свет дуальны, што дабро і зло суіснуюць і грэшнаму чалавеку складана разабрацца ў тонкасцях іх узаемаадносін. Раней давялося мне пачытаць апісанні колішніх паломніцтваў аўтарства Уладзіслава С. Рэйманта ды Эгана Э. Кіша, а нядаўна паявілася нагода і асабіста спрактыкаваць гэтакае падарожжа.

Падарожжа далёкае і ў наш час свае ці худобіны ногі падмяняюць колы быстраходных машын. Паездка пачалася ноччу, а паколькі пілігрымка з'яўляецца калектыўным мерапрыемствам, дык складана ў такіх умовах асацыяваць яе з паэтычным апісаннем начнога палёту Антуана Сент-Экзюперы, а скарэй усяго з, далікатна кажучы, экзістэнцыяльнай драмай. Аднак жа вядома, што пасля худых гадоў наступаюць гады паўнейшыя, так і начная нявыгада канчаецца з прыходам світання, той прыгажосці прыроды, паху ранняй расы пад святлеючым небам. Не ведаю, ці гэтае супастаўленне ночы і світанку, цёмнага і светлага, не ляжыць у аснове шматлікіх грамадскіх плыняў, якія абяцаюць вывесці стомленых штодзённычынай людзей у нейкую светлую будучыню. Золак, аднак, нерукатворны...

Аўтобус калясіць праз Луцк, але не тут мэта падарожжа. Аднак выглядаючы праз акно хацелася б тут спыніцца, пахадзіць, пабачыць людзей і горад, пабачыць яго каштоўнасці — гэта цікавасць, гэта ахвота пакаштаваць грэшную ягадку з выдваранага з раю дрэва пазнання дабра і зла. Але ж пілігрымка мае ў шырокім сэнсе райскую мэту... Не ведаць радавому грэшніку пра дабро і зло — гэта ў сучасным нашым інфармацыйным грамадстве мэта цэнзуры, міністэрстваў „інфармацыі”. Значыць, у некаторых сучасных дзяржавах, напрыклад, у Кітаі, Паўночнай Карэі ці, не ходзячы за трыдзевяць зямель, у [...], народ жыве паводле больш ці менш строгіх райскіх інфармацыйных прынцыпаў. Не тое што ў нас, дзе глядзець у тэлевізар не хочацца...

У інфармацыйным ландшафце Украіны прысутнічае толькі ўкраінская мова — без ніякіх прымешак, без ніякай трасянкі. Тамашнія ўлады пакідаюць свайму народу ўсё ягонае спадчыннае багацце — матэрыяльнае і духоўнае. І моўная спадчына, як кроў і дасягненні продкаў, там у пашане...

Далейшай мэтай паездкі гарадок Гарадок, які па сутнасці з'яўляецца прыгарадам Роўнага. У самым пачатку мясцовасці буйны мёртвы завод — мабыць, памятка па савецкім мілітарна-прамысловым комплексе. Крыху далей, на востраве, манастыр з залацістымі купаламі цэркваў.

Канфесійны краявід Украіны даволі каляровы. Хаця рашучую большасць складае тут манатэістычнае хрысціянства, аднак яно само стракаціць там рознымі юрысдыкцыямі. І ў манастыры цэрквы „брацкія”: маскоўскага і кіеўскага падпарадкавання... У савецкі час гарадоцкі манастыр быў туберкулёзным санаторыем і тагачасныя дабрадзеі ашчаслівілі комплекс вадакачкай, якая крыху нагадвае бляшаны мінарэт без пакрыцця, крыху прыржавелая, сярод залацістых купалаў...

Прашу тут дазволіць экскурс у суседнюю і адлеглую мінуўшчыну. Нядаўна пайшла па свеце чутка, што некаторыя маскоўскія патрыёты хочуць узвесці ў сан святых самога Іосіфа Сталіна, за ягоныя заслугі; лічыць можна што гэта і смех, і грэх, і... нешта трэцяе. Бо ж у сталінскі час адбыліся падзеі, надта падобныя да тых іканаборскіх, што ўскалыхнулі Візантыйскай імперыяй у 8-9 стст., а верхаводзілі імі тагачасныя візантыйскія цары. Візантыйскую калатнечу завяршыла прыгожая царыца Ірына, якая дзеля ўлады і асляпіла ўласнага сына, а іншых паслала туды, што і найслаўнейшы Іосіф, і вярнула культ ікон, замацаваны рашэннямі II Нікейскага сабора. Як ні глядзець, наша рэлігія ў значнай меры нарміравалася ўсялякімі царамі і царыцамі, таму і пакланенне ім трэба лічыць заканамерным.

Савецкі іканаборскі перыяд пакінуў некаторыя сюжэты для рэфлексіі. Вось, аднаўляецца адна з цэркваў манастыра. Зараз у ёй стаіць грацыёзны іканастас з букавага арнаменту, напоўненага ювелірнымі іконамі — велічны твор мастацтва. А сцены яшчэ белыя, яшчэ не замазаныя ніякімі багамазамі ўзведзеных у сан святых пасрэднікаў між Богам і чалавекам. Я тут крыху іканаборнічаю, але ў мяне ёсць дзеля гэтага некаторыя асновы. Бо верніку трэба пакінуць нейкае акенца, нейкую асабістую перспектыву... Відзежы ж адбываюцца непасрэдна, а і Майсей хадзіў на Сінай сам... Зайшоўшы ў бязлітасна размаляваныя сцены Свята-Духаўскай царквы ў Беластоку я адчуў сябе быццам у нейкім рукатворным каконе. А вось у аднаўляемым пасля саветаў гарадоцкім храме адчуваецца прысутнасць Сусвету.

Калі вернікі сталі спяваць „Верую”, пачуў я за сабою жаночы голас, у якім час ад часу паяўляліся кванты грацыёзнага сапрана. Аглянуўся я — уладальніцай незвычайнага, але запушчанага голасу была жанчына нецікавага калгасніцкага выгляду. Можа яна атрымала такі раскіданы дар, але не атрымала дару прывесці яго ў парадак... Не ўсім жа царкоўным спевакам наканаваны шлях Шаляпіна.

За чарговымі кіламетрамі быў „істочнік”, дзе акунанне ў ваду мела прынесці гаючыя вынікі; пра такую ваду ў Лурд быў калісь пісаў згаданы раней Эган Кіш і хай такі грэх будзе за ім. А зараз каля басейна была і студня, дзе можна было набраць той крынічнай вады. Крыху народу каля тае студні было і ўсе рупіліся „в очереди”, але кожны індывід у сваёй уласнай. Шчасце толькі, што Бог стварыў чалавека на сваё падабенства, не даўшы яму ні рагоў, ні капытаў.

Начлег здарыўся ў паслякалгасным адміністрацыйным будынку, прыватызаваным на гатэль. Новы ўласнік рыхтаваў яго, мабыць, з думкай пра надта аскетычных пілігрымаў, аднак сама назва „гатэль” патрабавала, відаць, некаторых выгад. І так — у нумарах ёсць шафы, але павесіць у іх нейкую вопратку немагчыма, бо тыя шафы складаюцца адно са сцен і дзвярэй — ні вешалак, ні полак, ні нават перакладзін у іх няма. Няма таксама ніякіх вешалак і ў душавых кабінах; мабыць, каб заходзіць туды так як маці нарадзіла і адчуваць там сябе як Адам ці Ева ў раю. Па суседску з душам — туалет з двух паралельных сядзенняў не адгароджаных ад сябе ніякай сценкай; гэта прыгадала мне раннія пяцідзесятыя гады, калі ў нашых вёсках „выходкі” не былі самай першай бытавой патрэбай і санітарныя справы спраўляліся за хлеўчыкам, бывала — у прыязнай кампаніі. Вось, паехаў за ўзнёслай мэтай і трапіўся сентыментальны такі ўспамін...

Начаваў там і савецкі паломніцкі народ, які паўставаў недзе на досвітку і паводзіў сябе даволі калектыўна, як „воины-победители”, гарланячы на калідоры і соваючы насы куды папала, не зважаючы, што не ўсім яшчэ была пара ўставаць. Нават певень з суседняга панадворка паводзіў сябе намнога культурней, абвяшчаючы пад'ём недзе перад восьмай гадзінай; мабыць, быў гэта певень спецыяльнай пароды, выведзены паслядоўнікамі Траxіма Лысенкі дзеля абвяшчання нарміраванага працадня з пачаткам у восем гадзін раніцы.

Галоўны храм пачаеўскага манастырскага корпусу мае не так візантыйскія, як італьянскія архітэктурныя карані, ды і выглядам сваім больш нагадвае музей, дзе ўся прастора закрыта творамі іканаграфічнага мастацтва. Мастакі-то памаліліся, пішучы свае іконы напэўна не ў тлуме. І падзвіжнікі ж аддаляюцца для малітвы ў самотныя скіты. І Ісус маліцца падаўся ў пустыню... Народ у згаданым храме то прыходзіць, то выходзіць, то тоўпіцца, каб прыкласціся да ікон. І не надта ж бясшумны ён, не з анёлаў — у час пропаведзі з-за гэтага шуму не ўдалося мне пачуць ніводнага слова прапаведніка...

Установа, якая з'яўляецца мэтай нейкіх масавых падарожжаў, мусіць быць свайго роду фірмай масавага абслугоўвання людскіх патокаў; пачаеўскі комплекс таксама выконвае такую ролю, ролю канвеера, і некаторыя меры, здавалася б цалкам неканкрэтныя ў гэтым плане, спрыяльныя паскарэнню руху людскіх мас. Каб не было вялікага абурэння за чарговыя абзацы, я прыгадаю тут, што некаторыя дары прымаюцца ў рот, а што пасля з імі дзеецца, пра гэта намольнаму народу не выпадае гаварыць: у тамашніх прыбіральнях заміж сядзенняў паложаны прыседнікі — мабыць, каб карыстальнікам не надта выгадна было, каб усё скарэй адбывалася. А калі ў каго хворыя ногі і прыехаў ён з верай у цудоўнае аздараўленне, ці яму такія ўмовы не надта цяжкія?.. Магчыма, што вытворца гэтакіх „выгад” пахадайнічаў перад манастырскім першастаяцельствам з нейкай ахвярай... І яшчэ адно ўзбуйненне прапускной здольнасці манастырскага канвеера: да споведзі прымаюцца там толькі авечкі маскоўскага пастырства.

Сам гарадок Пачаеў невялікі, маштабу будзе ён нашага гміннага мястэчка. Недалёка манастырскага комплексу знаходзіцца невялікі парк, а пасярэдзіне яго — помнік са статуяй бравага ваякі. Паколькі на тым аб'екце не было ніякай інфармацыі, спытаў я седзячых непалёку мужчын, каму той помнік. Яны здзівіліся майму прафанству, але патлумачылі, што помнік Багдану Хмяльніцкаму. І дабавілі, што была калісь на помніку таблічка з прозвішчам героя, але недзе яна прапала. У адным з куткоў парку мармуровая стэла ў гонар паўстання Украінскай паўстанчай арміі, у іншым — крыж з інфармацыяй, што на тым месцы мае паўстаць помнік ахвярам Галадамору.

Запраўляемся на адной са станцый каля Львова. На бензакалонках пачэплены таблічкі з дадатковай інфармацыяй на каля паўтара дзесятках еўрапейскіх моў: малдаўскай, харвацкай, партугальскай, нарвежскай... Характэрная там, аднак, не прысутнасць моў, але іх адсутнасць: няма там ні рускай, ні польскай інфармацыі. Няма там яшчэ адной мовы, але думаю, што наш кемлівы чытач сам здагадаецца пра яе.

Ужо на тэрыторыі Польшчы спыняемся на малебен у царкоўцы на месцы былога праваслаўнага манастыра ў Турковічах, між Тамашавам і Грубешавам. Людзі шчыльна кленчаць і ў той час у царкву ўваходзяць два маладзёны, мабыць, актывісты маладзёжнага брацтва тамашняй епархіі, якія нясуць нейкія прадметы на хоры. Хочуць прайсці, турбуючы вернікаў на каленях. Папрасіў я іх, каб хвіліну пачакалі і яны пакорліва спыніліся. Але ж у народзе склалася пагаворка пра чорта і бабу... Неўзабаве з'явілася за імі нейкая рэлігійная камсамолка, энергічна пшэкаючы „Przepraszam, przepraszam...”, прыкрыкнула на хлопцаў — перад маладой нахабнасцю бедныя вернікі паўставалі ад малітвы. За буянкай задаволена крочыў малады святар...

Можа хто абурыцца, што заміж sacrum прысвяціў я столькі ўвагі profanum. Але ж прыгаданы мною Каран (17:11) сцвярджае, што чалавек кліча зло так як і дабро, бо паспешлівы ён. І грэшны ён з самога пачатку, бо ж яшчэ ў Эдэме, як паведамляе кніга Быцця, Адам спакусіўся ад Евіных яблычак, а Ева — ад вужа, што выпаўз з Адамавага зарасніку. І я грэшны, і каюся за дапушчаныя тут вольнасці: mea culpa, mea culpa, mea maxima culpa.

Кастусь Казлоўскі з Гарадка

— У першую чаргу запрашаем на сцэну літаратурную групу „Калоссе” пад кіраўніцтвам Кастуся... Каліноўскага! — пачаў быў прадстаўленне на гарадоцкіх дажынках 2007 года вядучы мерапрыемства. — Ой, прабачце, Кастуся КАЗЛОЎСКАГА!

На сцэну над штучным вадасховішчам у Падрэчанах выйшлі былі члены літаратурнага гуртка, што дзейнічае ў Гарадку — не першы раз. Восьмы год дзейнічае „клуб тых што пішуць”. На ўсе мерапрыемствы рыхтуюць сваю праграму, са свежымі вершамі, з песнямі. Усе ў майках з эмблемай, у капелюшах. Эх, не сфільмавалі нас тады, — уздыхае пасля непадалёк кастра, на выгане, за гасціннай лавай Кастусь Казлоўскі. — Самі неяк рыхтуем праграму. Няма ў нас інструктара.

— Пра ўсё гэта, што робім, думае Косця, — хваліць калегу Янка Карповіч. — Ён ужо ў галаве сцэнарый мае, прыходзіць: так і так зробім, ты і ты так выступіш. — Тут не адна пахвала патрэбна, а вялікія воплескі! — прабіваюцца галасы паэтак. — Калі б не пан Казлоўскі, дык гэтага не было б. Чаго? Не рашыліся б мы выйсці на сцэну, каб прамаваць уласныя творы. Пісалі б мы іх паасобна, клалі б у шуфляду. Гэта наша галованька! Кастусь Казлоўскі можа пісаць у кожную пару! Мае матэрыял на сваю кніжку. Найлепш пішацца яму ноччу. У кацельні: — Каб не спаць, простая справа. Чалавек ходзіць, думае, думае.

Міра ЛУКША

Дзе Плоскай вада рве берагі

На заходніх ускраях Гарадоцкай гміны ў прытоках Плоскай змяшчаецца поўная красы даліна. З аднаго боку апіраецца яна ў рад стромых марэнавых пагоркаў, са своеасаблівым мікракліматам у выніку добрага сонечнага абагравання. Акалена яна з усіх бакоў лясамі Кнышынскай пушчы багатымі ў ягады і грыбы, да нядаўняга часу была аазісам цішы і спакою. Сёння гэты ідылічны вобраз часткова псуюць міжнародныя грузавікі, што мчацца па шляху Беласток — Ваўкавыск. Незалежна ад гэтага заблукаўшы сюды вандроўца, што паставіць сваю палатку на беразе Плоскай, можа разлічваць на тое, што знойдзе тут чыстую ваду, багатую ў стронгу. Падыхае свежым паветрам, прасякнутым пахам мяты і свежага сена. А ўвечары, калі запалае вогнішча, а змрок ахіне зямлю — пачуе прыгожую легенду, што ад вякоў паўтараецца ў пошуме дрэў і чаратоў — пра генезіс Каралёвага Моста.

Сонца кранала ўжо верхавіны дрэў, калі полы шатра расхінуліся і паказаўся ва ўсёй сваёй постаці і хвале кароль Зыгмунт Аўгуст. Найперш правёў агляд абозу, у якім працягвалася перадвячэрняя мітусня. Служба рыхтавала вячэру, управлялася з коньмі. Ніжэй абозу расцягвалася багонная даліна, у цэнтры якой вілася рэчачка. Не была яна шырокай, ды вельмі мулістай і не была прыгоднай для коннай пераправы. Аўгуст загадаў, каб на працягу мінаючага пасляпоўдня і ночы быў узведзены тут мост. Паспешліва сазвалі сюды навакольных дрывасекаў. Іх рады падмацавала значная частка службы і пахолікаў каралеўскай світы. Цяпер з боку ракі далятаў водгалас удараў дзесяткаў сякер. Заўтра па гэтым мосце кароль пераправіцца на другі бок, каб запаляваць на буйнога звера. Шмат тыдняў ішоў па лясах і барах, шукаючы ягоных слядоў. Забіў дзесяткі аленяў, ласёў, дзікоў, ды ніколі не мог натрапіць на след тура. Так вельмі хацеў асачыць гэтага звера, бо ж гэта якраз прыдало б хвалы і бляску ўсім паляванням. Толькі тут на ўсходніх ускраінах знайшлі адбіткі капыт аграмаднага быка. Дзесьці там, у багонных нетрах мае сваё логава гэты некараваны пан і ўладальнік лясоў. Кароль правёў зрокам па стромкім насе пагоркаў на супрацьлеглым баку даліны. Пакрытыя яны былі густым хваёва-яловым дрэвастоем, пратыканым дубінай, грабінай і бярэзінай. Пасля захаду сонейка гэты лес выглядаў шэра ды змрочна.

— Ужо заўтра пасярод гэтых дрэў адбудзецца сустрэча двух каралёў і завершыцца лёс аднаго з іх. — Панад рэчкай і багнамі ўзнялася белая як малако імгла, павольна перасоўваючыся ў напрамку абозу. На месцы пабудовы моста запалалі вялікія кастры, асвятляючы нахлынаючы морак. — Пара ўжо на вячэрнюю малітву, вячэру і спачын, — падумаў Аўгуст, накіроўваючыся да найвялікшага шатра ў абозе.

Бледным світанкам сабакі-ганчакі пайшлі ў лес. Яшчэ не падняліся спавівы імглы, што ахутвалі даліну, калі лоўчы разам з нагонкай і аграмаднай зграяй псоў пераправі лі ся на другі бок ракі. Яго заданнем было знайсці след звера, выгнаць за багны на вышэйшы, сухі груд і асачыць яго. Гукам рога меў паведаміць кара ля аб выкананні задання. Пры мосце праца працягвалася. Канчалі класці памост са склюдаваных дубовых камлёў. На стомленых тварах людзей віднела радасць. Бо хоць мост не быў самавіты, ды збудаваны быў моцна.

Сонца падымалася ўсё вышэй, абліваючы даліну залацістым зззяннем. Здаровае паветра ранка перапоўненае было пахам багны, перамяшаным з араматам квецця і траў. Кароль аднак не звяртаў увагі ані на красу наваколля, ані на багонныя пахі. Нервова прахаджваўся паміж шатром і канём, якога пахолік трымаў напагатове. З заклапочаным тварам услухоўвася ў водгаласы з супрацьлеглага боку даліны. Там аднак панавала ціш, якую ледзь каламуціў далёкі, ледзь чутны брэх сабак. Час няўмольна праплываў, а сігналу не было. Аўгуст прысеў на прыкрытым дзічынай скурай пяньку, які прыкаціла служба. Заплюшчыў павекі і чакаў. Дзесьці ў глыбі душы пачынаў яго мучыць неспакой, што паляванне не здзейсніцца. Сонца ўздымалася ўсё вышэй, кідаючы на зямлю ўсё цяплейшае праменне. Быў гожы вераснёўскі дзень. Раптам рог прамовіў.

— Па конях! Трубіць выязнога! — загадаў кароль і, не чакаючы пацвярджэння сігналу, у некалькіх скоках дабег да свайго аграмака. Без падмогі пахоліка ўскочыў на конскую спіну і галопам рушыў к масту. Ударылі падковы аб дубовыя камлі. Стомленыя дрывасекі сагнулі спіны ў паклоне, але кароль гэтага не бачыў. А за ім у бязладдзі галопам мчалася ягоная світа.

Выгнаны са свайго логава і асачаны ў падножжа пагоркаў тур рыхтаваўся да абароны. Быў гэта здаровы, дзесяцігадовы бык карычневай масці са светлай палосай уздоўж хрыбта. Схіліў ён вялікі кучаравы лоб, узброены ў больш чым на паўметра выгнутыя наперад рогі. Пагрозліва рыкаючы, гроб пярэднімі раткамі так энергічна, што зямля разам з подсцілам узлятала высока ўверх. Крывавымі вачыскамі ўважліва сачыў за кожным рухам акаляючых яго сабак і людзей. Гэтых першых, што ўсчыналі вялікі гам, звер меў за нішто. Сабакі былі падобныя на ваўкоў, з якімі сустракаўся досыць часта і не раз пратрапаў ім скуру. На тура жах наводзілі постаці людзей. Да гэтага часу не меў з імі ніякага кантакту. Ды інстынктыўна адчуваў, што з іх боку чакае яго найбольшая пагроза.

Аўгуст асадзіў аграмака ў месцы. Тое, што ўбачыў, было заадно цудоўнае і жахлівае. Тур змагаўся за жыццё. Атакуючых яго сабак браў на свае доўгія рогі і падкідваў уверх, раздзіраючы прытым ім жываты так, што выпадалі вантробы. А тых, што не трапілі на рогі, дабіраючыся быку да гарляка, бязлітасна таптаў раткамі. Чутны быў хруст ламаных касцей і скавытанне канаючых жывёл. Паспешліва нарыхтавалі да стрэлу цяжкую рушніцу, якую замацавалі на падстаўцы ўбітай у зямлю. Кароль меціў доўга, памаленьку зводзячы курок. Раптам адчуў моцны ўдар ствала ў плячо, а постаць звера засланіла шэрае воблачка дыму. У момант выстралу тур адбіваўся ад чарговай атакі раз'юшаных сабак, таму раптоўна апусціў галаву, пасоўваючыся на два крокі ўперад. З-за гэтага выстрэленая куля трапіла яго ў спіну, балюча параніўшы. На светлай палосе выступіла чырвоная крывавячая стужка. Рык жаху і болю, шматкроць адбіты рэхам ад пагоркаў, праляцеў па даліне. Тур, наперакор логіцы, замест спрабаваць уцёкаў, рашыў атакаваць сваіх праследнікаў. Як таран рушыў на людзей. З мызы ляцелі яму шматкі пены, з-пад ратак — грудкі зямлі, а ўсё, што апынулася на яго шляху — знішчанае валілася пакотам. Не было часу нанава завесці рушніцу. Аўгуст вышарпнуў з-за пояса пісталеты з пазалочанымі рукаяткамі і, не меціўшы, двойчы стрэліў. Прагучалі таксама стрэлы каралеўскай аховы. Звер спавальнеў, хіснуўся, сілай імпэту зрабіў яшчэ пару крокаў і... звалiўся. Укленчыўшы на пярэдніх нагах, паклаў сваю цяжкую галаву так, быццам даваў пашану пераможцу.

Шматкроць рэха паўтарыла голас рога, што апавяшчаў памыснае завяршэнне ловаў. Твар караля шчасна прамяніўся. На складзеных з яловых жэрдак валоках цягнулі буйнога быка. Уязджаючы на мост, Аўгуст спыніўся. Уважліва агледзеў мост ды рухам далоні паклікаў к сабе пісара і хранікёра ў адной асобе.

— Цешыцца маё сэрца ўдалым паляваннем і знакамітай працай маіх падданых пры пабудове, — сказаў. — Сапраўды бачу, што гэты мост варты караля, таму даю загад, каб служыў агульнаму дабру. А паколькі гэта каралеўскі мост, таму даю прывілею пабору мыта за праезд. А ўладальнікамі чыню будаўнікоў, людзей працоўных. Хай так будзе запісана навекі.

* * *

Праз амаль сто гадоў праз Аўгустаў мост праязджаў іншы кароль — Ян III Сабескі. Пры рачулцы распаложана было ўжо невялікае паселішча з карчмой, у якой падарожнікі маглі адпачыць і пажывіцца. У гонар каралеўскага праезду і папасу мясцовасць назвалі Янаполем. Толькі праз наступныя стагоддзі ўспомнілі, што мост на рацэ Плоскай служыў двум каралям. Каб не паменшыць вялікасці ні аднаго з іх, памянялі назоў мясцовасці на Каралёвы Мост, значыць, мост каралёў.

Пачуў і запісаў у шасцідзесятыя гады ў Пачатковай школе ў Каралёвым Мосце ад настаўніцы Кастусь Казлоўскі.

Беларуская літаратура прысутная ў Вугоршчыне!

Прамоцыя беларускай літаратуры ў свеце гэта марудны, складаны працэс, які патрабуе паслядоўнасці і часу. Пра гэта добра ведае гаспадар Villa Sokrates, які дзесяць гадоў запар ладзіць мастацка-літаратурныя семінары, г.зв. „Трыялогі". Сярод удзельнікаў сустрэнем пастаянных сяброў ідэі. Адным з іх з'яўляецца перакладчык і загадчык Кафедры паланістыкі, Лаяш Палфолві з Будапешта. Я пацікавілася літаратурным плёнам, які за апошнія гады выспеў на беларуска-венгерскай ніве:

„Ніва": — ***Колькі гадоў Вы ўжо на „Трыялогах" у Сакрата Яновіча?***

Лаяш Палфолві: — Чатыры гады.

— ***Як гэты час паўплываў на прамоцыю беларускай літаратуры ў Вугоршчыне?***

— Ужо пасля першых „Трыялогаў" на старонках літаратурнага часопіса „Nagyvilág" („Вялікі свет" — ён адпаведны польскаму часопісу „Literatura na Świecie") з'явіліся паасобныя тэксты беларускіх аўтараў. Таксама ў штогодніку „Annus Albaruthenicus" друкавалася салідная падборка беларускай паэзіі па-венгерску. Зараз я рыхтую тэматычны блок, прысвечаны беларускай прозе. Да гэтай пары мы выбіралі такіх беларускіх аўтараў, якія раней былі перакладзены на польскую мову. Проста, у нас няма перакладчыкаў, якія ведалі б беларускую мову і перакладалі б тэкст з арыгінала. Апошнім часам я спрабаваў дайсці да аўтараў, якіх тэксты не былі перакладзены на польскую мову.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

— ***Аб кім гаворка?***

— Хочам надрукаваць апавяданне Алеся Бадака пра культ літаратуры, канкрэтна пра культ Купалы, і апавяданне Андрэя Федарэнкі пра Чарнобыль. Перакдады гэтых аўтараў былі зроблены з перакладаў на рускую і англійскую мовы. Ці гэта зразумела?

— ***Больш-менш, хоць не зусім! Скажыце, ці беларуская літаратура прысутная ўжо ў свядомасці венгерскага чытача?***

— Несумненна, сярод спецыялістаў існуе ўжо свядомасць даступнасці беларускай літаратуры. Сама папулярызацыя гэта складаны працэс. Для гэтага неабходныя літаратурныя сустрэчы, намаганні, сродкі. Вясной наша кафедра плануе канферэнцыю, на якую хочам запрасіць беларускіх аўтараў.

— ***Менавіта: як выглядае справа кантактаў?***

— У Венгрыі ўвесь час паяўляюцца людзі з Беларусі. Як нядаўна, калі ў Будапешце праходзіла канферэнцыя, прысвечаная камп'ютэрнай журналістыцы.

— ***Ці прамоцыяй беларускай літаратуры ў асноўным займаецца Ваша Кафедра паланістыкі?***

— Гэтая цікавая справа. Побач паланістыкі ў нас дзейнічае сярэднееўрапейская спецыялізацыя. Там маем больш магчымасцей. Якраз дзякуючы гэтай спецыялізацыі мы змаглі запрасіць Сакрата Яновіча, Алега Латышонка і Яна Максімюка. Я спадзяюся, што на згаданую ўжо вясеннюю канферэнцыю мы зможам запрасіць людзей з Польшы, Беларусі і Захаду.

— ***Год таму мы гаварылі пра асобнае выданне „Анталогіі беларускай паэзіі" па-венгерску. У гэтай справе Вы звярталіся ў беларускае пасольства. Якія вынікі сустрэчы?***

— Нічога не атрымалася. Хаця цешыць тое, што беларускае пасольства стала больш актыўным. Зараз яны засяродзіліся на прэзентацыі мастацкіх выставак!

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК

Калі гавораць аб гісторыі Беларусі, то немагчыма ўявіць сабе гэтую размову без узгадвання Полацка. Полацк — сімвал Беларусі, нягледзячы на тое, якая ў ёй пануе ўлада, якое стаўленне да розных гістарычных сітуацый праяўляе афіцыйная гістарычная навука.

Пазнаёміцца з гісторыяй Беларусі і, у прыватнасці, з гісторыяй Полацка сродкам аднаго газетнага артыкула немагчыма і наўрад ці трэба. Разам з тым, такога артыкула дастаткова, каб даведацца аб Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку, сайт якога месціцца ў інтэрнэце па адрасе: http://www.polotskmuzey.vitebsk.by.

Калі зазірнуць на галоўную старонку, то яна, як і належыць музейнай паважлівасці, прапануе нам віртуальнае знаёмства з гістарычным сайтам на некалькіх мовах. У дадзеным выпадку іх тры — беларуская, руская і англійская.

Першая ж старонка сайта выкананая ў някідкіх карычневых і шэрых танах. Гэтым самым распрацоўшчыкі сайта, трэба разумець, імкнуліся перадаць праз колер старадаўнасць тэматыкі.

Выяўленняў на сайце не надта многа. Першая старонка перадае аддалены выгляд горада, дзе на першым плане добра бачныя купалы цэркваў і старадаўнія будынкі.

„Мы любім наш Полацк і жадаем падзяліцца з Вамі гэтай любоўю", — звяртаюцца да віртуальных наведвальнікаў аўтары сайта. І трэба, пагадзіцца, што сайт зроблены не толькі з любоўю да Полацка, але і вельмі прафесійна. Здаецца, на ім няма нічога залішняга, выйсці на ўсе рубрыкі працуюць і нічога не засталося на дапрацоўцы. Зазірнем на старонку, якая дае цэльнае ўяўленне аб музеі-запаведніку. Яна называецца „Музеі" і распавядае пра тыя аб'екты, што ўваходзяць у запаведнік. Іх, дарэчы, не так ужо і мала — 11 музеяў, сярод якіх Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора, Музей беларускага кнігадрукавання, Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага і Дзіцячы музей. Да кожнага музея дадаецца невялікі расповед і адрас установы.

Паколькі адной з галоўных задач кожнага музея з'яўляецца вядзенне навуковай дзейнасці, то на сайце мы можам пазнаёміцца з тым унёскам у гісторыю Беларусі, які робяць супрацоўнікі ўсіх вышэйзгаданых адзінаццаці музейных устаноў.

Цікавай падаецца і гісторыя музея. Інфармацыю аб ёй мы можам знайсці ў рубрыцы „Гісторыя". Дарэчы, як згадваецца на старонцы, фармавацца гэты музейны комплекс пачаў не надта даўно — напрыканцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя.

Музей-запаведнік праводзіць на сваёй тэрыторыі выстаўкі, фестывалі і канферэнцыі. Праўда, тут мы заўважым адзін з недахопаў, што прысутнічае на сайце — інфармацыя аб гэтых імпрэзах не абнаўлялася з 2006 года. Цяжка пагадзіцца з думкай, што ад таго часу ў ледзь не галоўным музеі Беларусі не было ані выставак, ані навуковых канферэнцый.

Дарэчы, тое самае можна распавесці і пра рубрыку „Друкаваныя выданні". Згодна яе, ад 2006 года не было выпушчана аніводнай кніжкі ці брашуры.

Паколькі беларуская даўніна належыць не толькі Рэспубліцы Беларусь, але і цэламу чалавецтву, то на сайце прадстаўлена рубрыка „ЮНЕСКА". Увесь працэс падрыхтоўкі ўключэння беларускіх святыняў у прызнаны спіс агульначалавечага культурнага скарбу месціцца на гэтай старонцы.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

Золата не даецца

Адзін амерыканскі спартовы аналітык, дасведчаны з дасведчаных чалавек, напрарочыў беларускай дружыне на алімпійскіх гульнях 16 медалёў, прычым ажно 11 залатых. Напрарочыў — як сурочыў. Не, з колькасцю ўсё ў парадку — у скарбонку нашай каманды рэгулярна падае срэбра і асабліва медзь. А вось залатога медаля аніяк няма.

Найбліжэй да чэмпіёнскага тытулу наблізіўся наш штангіст Андрэй Рыбакоў, які лічыўся галоўным фаварытам у катэгорыі да 85 кг. Рыбакоў набраў найвышэйшую суму, усталяваўшы пры тым сусветны рэкорд, але столькі ж падняў і кітайскі атлет, які пры ўзважванні быў крыху лягчэйшым. Ахвярай „лішніх" 200 грамаў стала і наша штангістка Анастасія Новікава ў катэгорыі да 53 кг, якая з-за вагі была змушана задаволіцца толькі бронзай. А найбольш каштоўнага металу, як і чакалася, прынеслі айчынныя лёгкаатлеты. Дуплетам выстралілі кідальнікі молата Вадзім Дзевятоўскі і Іван Ціхан (адпаведна 2-е і 3-е месца), а таксама штурхальніцы ядра Наталля Міхневіч і Надзея Астапчук (такая ж карціна). Цікава, аднак, што перадалімпійскія акцыі Ціхана і Астапчук стаялі вышэй, чым у іх сяброў па камандзе. Для сям'і Міхневічаў гэтая алімпіяда выдалася надзвычай удалай, бо днём раней бронзавы медаль „выплавіў" Андрэй Міхневіч. Акрамя славы, бюджэт сямейнай пары цяпер папоўніць сума ў 80 тысяч долараў (за трэцяе месца беларускім спартоўцам дэкларавана па 30 тысяч, за другое — 50 тысяч, ну а першае ацэнена ў 100 тысяч).

Яшчэ адзін бронзавы медаль Беларусі прынёс барэц класічнага стылю Міхаіл Сямёнаў. Ягоныя калегі на п'едэстал не трапілі. А ўсе чатыры баксёры вылецелі ўжо пасля першых баёў — такой ганьбы наш бокс яшчэ не ведаў. А вось баскетбалісткі зноў парадавалі — выйшлі ў васьмёрку мацнейшых. Пра плыўцоў трэба будзе гаварыць асобна, адзначым толькі што на водных дарожках Пекіна ўдзельнікі паказвалі „звышчалавечыя" секунды, за якімі беларусы паспець не ў стане.

Пэўнае расчараванне спасцігла беларускіх аматараў акадэмічнага веславання. Здавалася непераможная Кацярына Карстан, якой усе спецыялісты заранёў аддавалі першынство, на гэты раз задаволілася толькі бронзай. Што ж, і ў вялікіх людзей бываюць слабіны. У той жа дзень бронзавы дуэт Афінаў Наталля Гелах — Юлія Бічак паўтарыў свой поспех чатырохгадовай даўніны. Фініш гэтага заезду таксама быў адзначаны для нас прыкрасцю — беларуская пара амаль да канца дыстанцыі ішла другой, але ўсё ж упусціла срэбра, якое дасталася кітаянкам. Гаспадары алімпіяды выскакваюць як чэрці з табакеркі, нават у тых відах, дзе іх яшчэ пару гадоў таму не было зусім. Не дзіва, што роўных кітайцам па залатых медалях на гэтай алімпіядзе няма. І яшчэ пытанне, ці здолеюць іх апярэдзіць ЗША па агульнай колькасці ўзнагарод. А вось звышамбітныя расіяне пакуль відавочна правальваюць свой план.

Адзначым і поспехі беларусаў, якія працуюць на карысць іншых краін. Так, галоўны трэнер зборнай Расіі па валейболе — ураджэнец Полацка Уладзімір Алекна. Пад яго кіраваннем зборная Расіі ідзе без параз і ўжо адолела чэмпіёнаў свету — бразільцаў. А адзіны пакуль медаль для Літвы быў заваяваны пад кіраваннем беларускага спецыяліста Рыгора Казлоўскага — суседзі ўзялі бронзу ў грэка-рымскай барацьбе.

Пасля дзевяці алімпійскіх дзён Беларусь па суме медалёў (усяго — 10) дзяліла высокае 12-е месца. Канчатковыя вынікі будзем падводзіць праз тыдзень.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

„Белыя росы” ў Бандарах

Я ў сваім жыцці пабываў на многіх беларускіх фэстах, бачыў шмат калектываў. Але тое, што я пабачыў 19 ліпеня ў Бандарах, пераўзышло ўсе мае спадзяванні. А быў гэта калектыў „Белыя росы” з Гродна, выступленне якога поўнасцю мяне зачаравала. Вялікае дзякуй войту Міхалоўскай гміны Марку Назарку за тое, што стрымаў дадзенае Бандарскаму салэцтву слова і на „Бандароўскую гасцёўню” запрасіў менавіта гродзенскія „Белыя росы”.

Захапляўся я красой гібкіх артыстак, якія ў танцы быццам матылі лёталі ў паветры. Зачаравалі таксама стройныя бы белавежскія дубы танцоры. І менавіта дзякуючы вялікаму майстэрству ансамбль „Белыя росы” вядомы ў свеце. Пацікавіўся я гісторыяй ансамбля і вось што мне расказалі яго члены.

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Ансамбль „Белыя росы” на фэсце „Бандароўская гасцёўня”, 19 ліпеня 2008 г.

Ансамбль песні, музыкі і танца „Белыя росы” Гродзенскай абласной філармоніі заснаваны быў у 1987 г. заслужаным работнікам культуры Яўгенам Штопам. Запрасіў ён у калектыў маладых артыстаў з розных рэспублік тадышняга Савецкага Саюза. Першапачаткова ансамбль саставілі артысты балета, музыканты і вакалісты з Беларусі, Расіі, Украіны і Эстоніі. За час свайго існавання „Белыя росы” далі больш за тысячу канцэртаў на сцэнах Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Літвы, Польшчы, Германіі, Францыі, Швейцарыі, Іспаніі, Партугаліі і іншых краін. Ансамбль стаў пераможцам і лаўрэатам многіх прэстыжных еўрапейскіх фестываляў. Удзельнічаў ён у запісе забаўляльных праграм для іспанскага тэлеканала TVE1, быў удзельнікам культурнай праграмы Сусветнага эканамічнага форуму ў Давасе ў Швейцарыі, Дзён Рэспублікі Беларусь у Расіі (Масква і Краснадар), Швейцарыі, Германіі і Францыі.

Цяпер мастацкім кіраўніком ансамбля з’яўляецца таленавітая балетмайстар Вера Чычына. Яна працуе ў калектыве з першага дня яго заснавання — спачатку ў якасці артысткі балета, потым як рэпетытар, а з 2003 года стала яго кіраўніком. Хаця ансамбль не з’яўляецца этнаграфічным калектывам, то да фальклору ставіцца ён беражліва, удумліва, доследна — як да жывой крыніцы, якая спрыяе творчасці ансамбля, натхняе яго на новыя пошукі. Напрыклад, народныя танцы нашых продкаў, пабачаныя і прачытаныя вачыма сучаснага мастака, аказваюцца непаўторнымі і на здзіў сучаснымі. Пацвярджэннем гэтаму з’яўляецца новы этнапраект Веры Чычынай „Аповесць былога сучасным пяром”, створаны на аснове беларускіх літаратурных твораў.

У арсенале калектыву — 450 нацыянальных касцюмаў, многія з якіх выкананы ўручную беларускімі майстрамі. Рэпертуар ансамбля складаюць творы як беларускага фальклору, так і фальклору іншых народаў і этнічных груп — цыганоў, казакаў, расіян, малдаван, а таксама паасобныя нумары, заснаваныя на музыкальным і харэаграфічным матэрыяле той краіны, у якой праходзяць гастролі.

Аркестр ансамбля карыстаецца вялікай колькасцю сучасных (баян, скрыпка, альт, гармошка, флейта, кантрабас, ударная секцыя) і старадаўніх (розныя дудкі, акарына, дуда, цымбалы, ліра) інструментаў. Аркестрам з дзевяці музыкантаў кіруе Аляксандр Аўрукевіч. Кіраўніком па рэпертуары з’яўляецца Аксана Кімкетава, хормайстрам — Тацяна Бейта, а дырэктарам аснамбля — Барыс Алтышкін.

Усе члены калектыву, які налічвае больш за сорак чалавек, уносяць творчы ўклад у дасягненні ансамбля „Белыя росы”, так што пра кожнага з іх можна было б напісаць асобны артыкул.

Віктар БУРА

Недагаворанасць?..

У 28 нумары „Нівы” ад 13 ліпеня друкаваўся мой допіс „Айчыннае трэба шанаваць”, у якім я кранаў праблему тэлекамунікацыйных паслуг фірмы „Rexel”. Паколькі справа стала дыскусійнай, тады вяртаюся да тэмы. І вось выявілася таямніца „ўзнагароды”, якую мне прапанаваў незнаёмец пры заключэнні дамовы. А было гэта так. 14 ліпеня пазванілі мне з аддзела абслугі кліента фірмы „Rexel” і заявілі, што з канцом месяца будзе скасавана дамова з Тэлекамунікацыяй польскай С. А., а затым у верасні атрымаю першы рахунак за жніверьскія паслугі іхняй фірмы. У час размовы папрасіў я суразмоўцу выслаць мне цэннік паслуг. Абяцала яна зрабіць гэта неадкладна. На пасылку аднак прыйшлося чакаць больш двух тыдняў. Якое ж было здзіўленне, калі ў прэйскуранце я ўгледзеў, што стаўка месячнага абанемента „ашчадны на неакрэслены час” складае не 27 зл., а 48,80 зл. Неадкладна, зваротнай поштай, паслаў я заяву з патрабаванем ануляваць дамову, бо мяне ашукалі. І тут справа высветлілася. Дамова са мною была заключана паводле прамоцыі „Dobry Rok”. Затым рэкамендаваліся ільготныя стаўкі: 1,22 зл. пры аднаразавай актывацыі і 22 зл. (нета) пры месячным абанеменце „ашчадны на неакрэслены час”. Усё затым згаджаецца. Ніякіх махлярстваў і ашуканстваў фірма не ўчыніла. На маё пытанне, якія стаўкі пасля будуць абавязваць, заявілі: дамову можна прадоўжыць на чарговы год (тады стаўка абанементу будзе складаць не 27 зл., а 36,60 зл. брута), або скасаваць яе на аснове раней прад’яўленай заявы. Патрабуецца пры гэтым месячны тэрмін апярэджання з уласнаручным подпісам. Пры такой здзелцы кліент не нясе ніякіх коштаў. Зараз стала вядомым, што рэкамендуе фірма „Rexel”. Шкада адно, што ўзнікаюць недаразуменні паміж бакамі з прычыны недагаворанасці. Мне здаецца, што прадстаўнікі фірмы „Rexel” у час размовы з кліентамі замала прад’яўляюць сутнасных аргументаў пры здабыванні прыхільнікаў для сваей фірмы. У народзе кажуць: „Рэклама — рычаг гандлю”. Варта аб тым памятаць.

Уладзімір СІДАРУК

„Спадчына” запрашае

Аматары беларускага фальклору Камянецкага раёна стварылі грамадскае культурна-адукацыйнае аб’яднанне „Спадчына”. Больш трох гадоў мы супрацоўнічаем з Домам культуры г. Кляшчэлі (РП).

У гэтым годзе мы адпачывалі, збіралі фальклор, удзельнічалі ў фэстах на тэрыторыі гміны Кляшчэлі: у Дабрывадзе і Дашах, а таксама ў Нурцы, Маліннікаў ды ў горадзе Гайнаўка. Не толькі дарослыя, але і дзеці з захапленнем спяваюць старажытныя абрадавыя песні, танцуюць кракавяк, польку.

А заснавальнікамі „Спадчыны” сталі ўдзельнікі клуба аматараў фальклору „Катрынка” Высокаўскага цэнтра пазашкольнай работы. Мы не толькі спяваем і танцуем, але яшчэ адраджаем крыніцы, добраўпарадкоўваем горад.

Запрашаем да супрацоўніцтва!

Наш адрас: 225080, вул. Леніна, 81, г. Высокае, Камянецкі раён, Брэсцкая вобласць. тэлефон (801631)71440, e-mail: cvr_vysokoye@mail.ru

Людміла Рыгораўна Дудар
Дырэктар Высокаўскага ЦПР

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — кітайскую пагаворку.

1. замкнёная крывая лінія ў выглядзе яйца = 22 _ 15 _ 20 _ 21 _;
2. з’яўленне новых грамадскіх думак ці ідэй або ... ачышчанне збожжа ад мякіны = 1 _ 14 _ 7 _ 31 _ 32 _ 33 _;
3. расійскі парламент = 8 _ 9 _ 12 _ 13 _;
4. прадукты харчавання = 26 _ 27 _ 28 _;
5. навейшыя фасоны ўбораў = 19 _ 16 _ 29 _ 30 _;
6. драпежная жывёліна сямейства сабачых, падобная да ваўка, якая харчуецца мярцвячынай = 10 _ 11 _ 5 _ 6 _ 17 _;
7. імя сучаснай украінскай палітычнай лідэркі = 18 _ 3 _ 4 _ 2 _;
8. паглыбленне ў зямлі = 23 _ 24 _ 25 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 29 нумара

Абракадабра, фае, салетра, Тыбет, базар, выгляд, праца, Берут, цэль, Укаялі, аэрадром.

Рашэнне: **Дабрабыт забывае пра бацьку і мацеру.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Міхалу Байко** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.

Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,
Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy” w 2008 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.
Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Загулялі ў Семяноўцы

Ужо традыцыйна 9 жніўня на Панцеляймона ў Семяноўку (Гайнаўскі павет) прыязджае шмат людзей. Бо тут і парафіяльнае свята, і народны фэст. Пасля поўдня перад святліцу прыходзяць жыхары ціхай і зялёнай у гэтую пару года Семяноўкі ды з усяго навакольля і апрача іх турысты ды курортнікі, якія любяць адпачываць ля Семяноўскага возера. У вёсцы гаманліва і шумна.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Спявае гурт „Арт-Пронар”

Гэта добрая нагода да сустрэч са сваякамі ды знаёмымі. Колькі аўтамашын стаіць на вуліцы! Колькі дзяўчат незнаёмых прыязджае! Юнакі так і цікуюць за імі. Так і водзяць вачыма за прыгажунямі. Некаторыя з дзяўчат так апранутыя, быццам прыехалі якраз сюды загараць на сонцы. Будуць новыя знаёмствы!

Так вось і сёлета ў суботу, 9 жніўня, Семяноўка была шматлюднай. Стаяла цёплае, сонечнае надвор'е. А гадзіне 15.30 войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч прывітаў прысутных жыхароў гміны, гасцей і мастацкія калектывы. Зычыў прыемна правесці гэты святочны час. Прадставіў публіцы замежных гасцей — начальніка ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Васіля Чэрніка і начальніка аддзела Апараты Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей РБ Аляксандра Сасновіча — ды старшыню Галоўнага праўлення БГКТ у Беластоку Яна Сычэўскага.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

І маці, і дочкі, і бабці — у Семяноўцы ўсе золатца карыстаюцца папулярнасцю

І пачаўся шматгадзінны канцэрт. Вяла яго Кацярына Бяляўская — інструктарка Гміннага асяродка культуры ў Нараўцы. Выступілі „Нараўчанкі” з Нараўкі, „Лайланд” і „Вясна” з Беластока, гасцінна „Неруш” з Мінска ды „Цаглінкі” з Ляўкова, „Арт-Пронар” з Нарвы і „Happy Night”. Плылі-луналі цудоўныя беларускія песні, гучала музыка. У народных строях красаваліся „Нараўчанкі”, „Цаглінкі” і „Лайланд”.

— Я прыехаў з жонкай Зінай з Беластока, — кажа спадар Косця Мацкевіч, што стаіць з ёю пасярод вуліцы — на пляцу перад святліцай і дэпо месца для публікі не хапае. — Мая жонка родам з Пасек, яна з Тарасевічаў. А мой дом вось там, насупраць хаты Юркі Кіслага, вуліца Школьная 32. Прыехалі пазаўчора, крыху парадак дома навялі. Цяпер я пенсіянер, працаваў у „Фастах”. Прыязджаем сюды наведаць родных, таксама і памерлых продкаў. Міла ўбачыць таксама аднакласнікаў з семяноўскай школы, вось, Юрку Кіслага, Зіну Кастанчук.

— Усе такія імпрэзы нам падабаюцца, — азываецца Лявон Лукша родам з Баб'яй Гары, што стаіць у групе знаёмых. Пазнаю сярод іх бацьку Юркі Шульскага, родам з Лукі, жыхара Беластока. — Тут і спыніцца можна, калі хто хоча пабыць даўжэй у Семяноўцы. Хоць бы і ў былой школе, дзе цяпер цэнтр экалагічнай адукацыі, і ёсць гасцінічныя пакоі. І ў людзей можна наняць пакойчык. Малее Семяноўка — дзяцей купляць не хочуць, бо грошай малавата! А наконт дзяўчат... Каб маладзейшых паняў больш прыязджала да нас, ахвотна запрашаем, такіх да гадоў шасцідзесяці, — смяецца. — Пабыць можна тут і ў суботу, нядзелю, возера пабачыць...

На лавачках — малыя і старэйшыя. З захапленнем услухваюцца ў спевы бабкі Олька Ігнацюк і Марыя Бірыцкая.

— Як добра, што прыехалі, што ёсць нагода павесяліцца, — кажа бабуля Олька. — Харашэ спяваюць. Мала нас тут старэйшых, павыміралі. У „Ніве” будзе аб нашым свяце? О, а я „Ніву” чытаю, ад самога пачатку!

Фурор выклікаў сваім выступам мінскі гурт, які прыехаў у 5 асоб, — „Неруш” (ехаўшы адразу на выступленне ў Мельнік). Існуе ён 10 гадоў і зараз вядзе яго Валянціна Гладкая. Сола спявалі Віктар Варонін, Дар'я Федарэнка і Наталля Сузановіч. У іх самыя прыгожыя галасы. Гледачы пачулі бравурнае выкананне песень „Ой у полі азярэчка”, „Ой хацела мяне маць”, „Шэрая лашадка”, „Вяргіня”, „Ты мяне падманула”, „Частушкі” і — на развітанне — „Дажыначкі”. І стала так светла і радасна на душы!

„Нараўчанкі” праспявалі тры песні „А ў лесе грыбы зарадзілі”, „Кукавала сівая зязюля” і „А ў полі крынічанька”. Столькі і „Цаглінкі”: „Ой у полі ніўка” і „Звіняць-звіняць звончыкі” ды дуэт „Цаглінак” (Уля і Юрка) — песню „Над ракою вярба”. Заваражыў публіку гурт „Сакрэт” з Міхалова з шырокім адборам славянскіх песень, які пасля 21 гадзіны працягваў іграць на танцах у самаўрадавай святліцы.

І так адгрымеў-адшумеў народны фэст у Семяноўцы. Ладзілі яго Гмінная ўправа і Гмінны асяродак культуры ў Нараўцы ды Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку.

(лук, ян)

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Публіка цешыцца!

24.08 – 30.08

(22.03. – 20.04.) Вельмі добры час на працу, пачатак новых праектаў і адукацыю. Калі салідна прыкладзешся да спраў, вынікі задзівяць не толькі цябе. У пастаянных сувязях паправа. Добры час на негацыяцыі і ўсталёўванне супольных стратэгій. Будзь асцярожны пры экстрэмальных дзеяннях.

(21.04. – 21.05.) Бурлівы тыдзень! Можаш страціць штосьці, за што моцна стараўся, або ўчыніць фальшывы крок, які будзе табе шмат каштаваць. Клопаты ў кампанейскіх адносінах. Не спалучай сяброўства з грашыма і не рабі інтарэсаў са знаёмымі. Пазбягай зайздрасці, будзь больш даверлівым.

(22.05. – 22.06.) Спазнаеш смак кахання. Ды ты не прытварайся ў нічым! Не загарайся да рэчаў, да якіх ты не надаешся. Час агромных змен, але хопіць табе на іх энергіі. Калі пачынаеш новыя мерапрыемствы, ідзі маленькімі крокамі.

(23.06. – 23.07.) Прымай пад увагу ўсе асцярогі, асабліва ад людзей, якія сапраўды табе жадаюць дабра — варта пакарыстацца іхнімі парадамі! Добра ў пары. Затое нейкія непаладкі з хатнімі рэчамі і прыладамі — будуць чамусьці ўсё псавацца. Зважай на свой пазваночнік і калені; адразу бяжы да доктара! Не натуживайся на працы.

(24.07. – 23.08.) Урэшце спакайней, лагадней! Усё ж пазбягай сітуацый, у якіх трэба выбіраць. У пары адрозненні, можа і банальныя, будуць нарастаць. Ільвы з 14-17 жніўня хай у паводзінах ставяць на інтуіцыю (каб шмат не страціць). Не слухай парад аб простых прыёмах. Змаганне за лепшае заўтра можа кончыцца благім паслязаўтрам!

(24.08. – 23.09.) Можаш ініцыяваць мерапрыемствы, якія будуць мець вялікае значэнне для будучыні. Канец месяца гэта час адных поспехаў. Хоць да 25.08. благія весткі, спешка, дробныя непаразуменні. Пазбудзешся баластаў і ўрэшце дыхнеш свабодна.

(24.09. – 23.10.) Сцеражыся зайздрасці і ахвоты маніпуляваць атачэннем. Будзеш пад уплывам экстрэмальных эмоцый, што не прыслужыцца тваім добрым адносінам з людзьмі. Пазбудзься таксама недаверу. Час мілых сюрпрызаў ад усюдыіснага Меркурыя і любоўнай Венеры. 30.08. можа здзейсніцца твая мара аб касмічным каханні.

(24.10. – 22.11.) Узрастуць твае маніякальныя думкі. Жорсткая шчырасць з поспехам папсуе твае адносіны з сябрам. Рэзкае паніжэнне энергіі, запаволь свае дзеянні. Не рабі нічога насілу, і не хавай сваіх слабасцей. Разумна збірай сілы да новых праектаў. Абмяжуй курэнне.

(23.11. – 22.12.) Ахвотна спаткаешся з кімсьці, хто здаўна ходзіць за табою (прыхільна глянеш нават на кагосьці, хто не вельмі табе падабаецца!). Рамантычны настрой. Шмат нагод для сустрэч з сябрамі. На большую імпрэзу ў сябе рашыся пасля 28.08.

(23.12. – 20.01.) Будзь лаяльны ў адносінах да партнёра, нават калі ў ім расчаруешся. Можаш адпачыць ад работы, выбрацца на нейкую лёгкую сустрэчу. Маеш агромны ўплыў на людзей, не паддаешся, дасягнеш усяго чаго хочаш, будзеш справядлівы і сумленны.

(21.01. – 19.02.) На пачатку тыдня надта вялікая патрабавальнасць да партнёра. Ды фунданіце сабе цудоўныя канікулы! І так не выдасі ўсяго! І не пераборшчвай з вітамінныміі прэпаратамі, калі ўсюды столькі свежай гародніны і садавіны!

(20.02. – 21.03.) Маеш шанц больш зарабіць, бо і добрыя ідэі трапяцца. Можаш разлічваць і на плённае супрацоўніцтва з кімсьці, хто падкіне табе добрыя інфармацыі і кантакты. 30.08. маеш шанц пачаць усё нанова, асабліва калі твая пара пераходзіла крызіс.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960